ЗЯНОН

Глёрыя Патрыя



Хвала Бацькаўшчыне!

Мілая Радзіма, Ты — уся мая памяць. Усё, што бачыў і перажыў за жыцьцё, усё, што пра Цябе чуў і чытаў і нават уяўляў — усё са мной. Ты, такая вялікая і прыгожая, перапоўніла маё сэрца і маю галаву. Калі назаву Цябе — белыя воблакі над Гаўёй і празрыстая плынь, дзе жывуць серабрыстыя рыбы, цёплае лета ў шуме вады і паўдзённых вятрах, вечны травень у квецені груш і звон... звон касьцельны над палямі плыве да віленскіх сьцен у маю калыску...

Ты, калысачка мая —
Мама маладая.
Ты люляй мяне, чакай,
Восень залатая.

Там мой шэранькі каток
Ў вішаньцы схаваўся.
Ты, калысачка мая —
Цьвет абсыпаўся...

Глёрыя! Хвала! Хвала цьвітучаму дрэву! Хвала зямлі і людзям, што, нібы цьвет пад вятрыскам, ападалі ў Цябе, у гоні Твае пад Пагоняй, на сьцяжыны Твае пад сьцягамі, у травы Твае за свабоду...

Вечнай памяці палеглых і закатаваных бацькі Станіслава і дзеда майго Яна, якіх ніколі не бачыў — прысьвячаю...

Зянон.



ЗЯНОН

Глёрыя Патрыя

(вершы і фатаграфіі 80-х гадоў)

Вільня
Таварыства беларускай культуры ў Літве
2000

УДК 882.6-1
ББК 84(4 Бел)
3-99

ISBN 9986-9228-7-9

© Зянон, 2000



Гэта й пра сябе сказаў паэт Зянон: "Найвышэйшая мера паэзіі — апісаньне прыроды й пачуццяў, што яна выклікае, зрэшты, у гэтым найвышэйшы зьмест усяго мастацтва..."

А паэзія Зянона незвычайная пры ўсёй вонкавай звычайнасьці, побытнасьці, карчыстай і караністай канкрэтнасьці. Паэт піша так, каб словам не абсекчы ні сучка, ні галінкі, каб словам не абтрэсьці расы, каб словам не запыніць вольнага ходу аблачынкі. Не агрубіць, не абнізіць, не абразіць словам. Захаваць дыханьне сіверу, пагляд начы, развагу валуна. Перш за ўсё — павага да слова, давер слову. Паэт не імкнецца ашаломіць нечаканасьцю параўнаньняў, уразіць кідзістасьцю метафараў, загіпнатызаваць каркаломнасьцю тэхнікі. За давер слова адказвае даверам паэту.

Паэзія Зянона беларуская сваёй душой, сваімі вачыма, сваімі вуснамі. Бо паэтам нарадзіўся Зянон, бо падданцам паэзіі пачувае сябе Зянон, бо на алтар беларускасьці паклаў сваё жыцьцё Зянон.

Рэдка ў якіх паэтаў гэтак супадае характар паэзіі з характарам роднага краю. А ў Зянона яшчэ характар ягоны ўвесь ад беларускае зямлі, ад беларускага неба, ад беларускай думкі. Дый паэтава думка да зорак сягае. Зямлю на неба, неба на зямлю запрашае паэт, бо толькі пільнавокі душою можа ўбачыць, як

Дзьве ластаўкі, быццам рыбы,
Купаюцца ў небе.

Хрысьціянін Зянон выступае супроць паганства: "Паганцы моцна прывязаныя да пачуццёвага сьвету. У іх няма ахвяраў дзеля духу. Адпаведна не існуе і духоўнага жыцьця..." Вядома, поўнасьцю пагадзіцца з гэтым нельга. Бо мяноўна паганскія карані нашага фальклёру й робяць яго непаўторна прывабным. І ў сьветаўспрыйманьні паэта Зянона чуюцца паганскія карані. Толькі паганскай падсьвядомасьцю можна адчуць і пачуць:

Але сосны жывуць зімой,
Таму чуецца ў іх
Вецер Млечнага Шляху.

І калі Зянон сцьвярджае, што "закон жыцьця, дадзены Богам дрэву, шмат больш высакародны, чым свабодная воля разбэшчанага чалавека", пад руку яго штурхае паганец аднекуль з прыпамяці. Бо ўвогуле паэзія —паганка ад нараджэньня, ад першага гуку свайго, дзе б ні ксьціліся яе — у царкве ці ў касьцёле. Паэзія натуральная, як само жыцьцё. І паэзія Зянона сапраўдная, бо натуральная.

Зянон умее самай ашчаднай колькасьцю словаў сказаць шмат, сказаць у часе, сказаць ва ўспаміне.

О, гарачая капуста!
Лыжка ў руцэ дрыжыць.

У кожнага, хто прачытае гэтыя два радкі, будзе свой успамін, свой сум па роднай хаце, па шчырым застольлі сямейнікаў.

Уражлівей ад любых метафараў гучаць найменьні роднай рэчкі Гаўі, вёсак і мястэчак, баравін ды балацявін. Бо продкі, калі давалі мёны навакольлю, былі паэтамі, няхай і безыменнымі. І жывуць у паэзіі Зянона вёскі й мястэчкі, рэчкі й вазёры вольна, як і некалі.

Пад'язджаем да Оршы.
Чуеце веліч
У ветры на полі?

А гэта пра стары Івянец:

Дыханьне каня
На торбе з аўсом заінела.
Марозны дзень.

Радок паэта ў адпаведнасьці з натурай Зянона цнатліва аскетычны. І калі прарываецца традыцыйны лірызм, ён ня йдзе далей загалоўкаў, як такіх: "Шкадаваньне асеньняга дня", "Мроя пад клёнавым лісьцем". Тут, так бы мовіць, традыцыя рукаецца з наватарствам.

Чытаеш, чытаеш вершы пра родныя краявіды, пра тое, што "адышлі ў зямлю радакі" (якое ёмістае слова!), што "стронцый у целе тлее", і раптам:

Дзіўна!
Трыста гадоў таму
Японец Басё
На другім канцы сьвету
Мне ў душу зазірнуў.

І гэта не даніна экзотыцы, а ўказаньне на тое, што паэт Зянон за ўзор узяў форму японскае паэзіі. Узяў, але гэтак зьбеларусіў, што яна шуміць, як тая лістоўніца каля беларускае хаты, дзе "доўга стукаюць кроплі аб ганак стары". І нідзе не падкрэсьліў, не заявіў формы верша. Бо ў іншамоўнага чытача выклікаюць паблажлівую ўсьмешку пазнакі: "Хоку. Пераклад з беларускае мовы".

Па-беларуску, пра беларускае кажуцца:

Ля старога млына
Курыць люльку млынар,
Нават вейкі ў муцэ.

А гэта ўжо зусім наш певень, з чыста беларускім мэнталітэтам:

Нібы дзяркач, так перамок чырвоны певень
Пад ліўневым дажджом.
Якія ўжо там куры!

Уся паэзія Зянона на падтэксьце. Сам паэт тлумачыць: "Вершы: Мала слоў. Рытм. Канкрэтнасьць думкі і пачуцьця, выяўленая праз падтэкст. Праз падтэкст пранікаем у сутнасьць рэчаў". Але паэт Зянон не навязвае чытачу падтэкст. Кожны вольны бачыць сваё ў Зянонавых вершах, сваю думку ткаць, пачуўшы думку аўтара, пераносіцца ў свае мясьціны, грукацца ў свае дзьверы, бачыць свае зоркі, чуць іх па-свойму. А ў Зянона:

Паслухайце,
Як шалясьцяць зоркі,
Быццам крылы стракоз.

Шчыры з панам Богам і з матуляй Радзімай паэт шчасьліва выдыхае, бо не прадаў душу д'яблу:

Як добра слухаць, што сэрца гаворыць,
Як добра пісаць, што чуе душа.

Убранзавелую лаціну запрашае ў дапамогу паэт Зянон, каб зьвярнуцца да ўкаханай Бацькаўшчыны.

Gloria patria — зіхоткая Бацькаўшчына. Зіхоткая, калі бачыш яе замілаванымі вачыма, калі молішся ёй нашчай душой, калі цябе хочуць пазбавіць Бацькаўшчыны.

Зіхоткая ад сьлёзаў штодзённае сустрэчы й ад сьлёзаў мусовае ростані.

Gloria patria — сьцішана й розгаласна, набожыста й выклікова гучаць вечныя словы пад непарушным скляпеньнем храма Бацькаўшчыны.

Gloria patria — гучаць малітоўна словы, бо неўміручыя.

Як Беларусь!

Адзьдзяка

Зянону

Місія ня прыходзіць з Галілеі —
На гэтым і стаяў Ерусалім.
А ён ішоў туды,
Дзе здрада тлее,
Дзе людзі ворагі сабе самім.
Каб ня памерці,
Зерне памірае.
Каб адцяніць сьвятло,
Лютуе змрок.
З часін патопу ў ціхіх
Хата з краю.
За сьхібны крок
Адказвае прарок.
Ішоў на сьмерць,
А ўсе чакалі цудаў.
Ішоў перад шалёнай гаманой.
За ўсе пакуты
Пацалунак Юдаў
Яму і быў адзьдзякаю зямной.

Рыгор БАРАДУЛІН

* * *

Памятаю, у "шасьцідзесятых" нарадзілася з нашай, маладых мастакоў, дапамогаю Першая рэспубліканская выстава мастацкай фатаграфіі "Маці мая, Беларусь". Сярод мноства тады "авангардных" пошукаў і спробаў уразіла стрыманая, спакойная і велічная серыя фатаграфій "Браслаўшчына", зробленая Зянонам; яна пакідала ў душы невыказнае пачуццё тугі і трывогі, нейкай жальбы аб страчаным краі — невядомай Бацькаўшчыне. Фатаграфіі запомніліся. Неяк прывычным стала бачыць на выставах, як паказваюць сваю зямлю, Радзіму праз запазычаныя прыёмы і метафары, праз чужую вобразную сістэму, спрабуючы "падсаладзіць" і "палепшыць" яе, саромеючыся за яе "нявіднасьць" і "беднасьць", спрабуючы надаць ёй "еўрапейскасьць". І ўсутыч не бачаць яе адметнасьці і ўнікальнасьці, яе праўды.

І вось перада мною кніга. Кніга вершаў і фатаграфій. Два струмені — паэтычных і мастацкіх вобразаў і пачуццяў. Яны пераплятаюцца і пераліваюцца з аднаго ў другі. Яны могуць існаваць паасобку, але ствараюць адну вялікую раку, раку лёсу чалавека і Радзімы. Тут няма выпадковасьці і абыякавасьці. Кожная дэталь гаворыць, сьведчыць: вось яна, твая зямля, тут твае продкі, твая будучыня. Яна прыгожая і адухоўленая. Яна вечная.

Пётра ДРАЧОЎ

Лісты да Бацькаўшчыны 11
Советныя радасьці 51
Вандроўкі 65
Чужыя гарады 75
Мой дом 81
Аб вечнасьці і часе 107
Радзіманьня 119
Вільня 131
Менск 143
Зорка Максіма 153
Хвароба 159
Паганскі дух 169
Сьвятло Хрыстыянства 177
Фатаграфіі 187
Прыпавесьці 239
Сумныя вершы 253
Апісы 263
Пропаведзі 267
Адлюстраваньне 285
Заценкі 333

О, зямелька мая,
Асьветленая каханьнем!



Лісты да Байкайшчыны



Сьвятло ў душы

Мне мроіцца белая вішня
На нашым двары
І месяц у хмарах
Над шпілямі вежаў.
Ціха ўспыхнуў ад зоркі сьлед
І расплыўся ў сіняй гары.
Помню пра гэта
ў зімовай начы.
Калі
ветах
плыве
ў вакне.



Зянон.
1958 г.

Папяловы смак

Не думаючы ні аб чым,
У чужой краіне,
На чужым беразе,
Ля чужой ракі
Разлажыў я агонь на вятрыску.
Смажыцца бульба ў прыску.
Смак яе на зубах,
Дым гаркавы, смаловы,
Пах папяловы.
Сьцелюцца іскры ўніз па вадзе.
Усе думкі мае пра Цябе.

Вечны сад

Шэпат тваіх вольхаў
І звон касьцёлаў,
Асака і бледны месяц,
Сад цьвітучы — белы пух.
І за сінімі лясамі
Трокі, Вільня, Ашмяна
У паўдзённых хвалях Гаўі —
Разам са мной
плывуць у вечнасьць.

1981 г.

На Браслаўскім замчышчы сустракаю ўсход

Летняе сонца ўзышло.
Жоўтае зьзяньне ў бляску азёр.
Падымаюцца ўверх туманы
І далёкія вежы плывуць над лясамі.
Толькі замак парос лебядой.
Адплылі на той бок
Старадаўнія чорныя лодкі.
Адкурэлі дымы,
Адзьвінелі падковы і песьні.
Гулка крокі мае стуганяць па каменьнях.
— Гэй, каштэлян, — крычыць мой голас, –
Гэй, каштэлян, бяда над намі!
Маўчыць замковы каштэлян.
І падымаецца туман
У жоўтым зьзяньні над лясамі.

1983.



Журботная радасьць спатканьня

1. Май

Юны месяц праз кволую зелень галін
Холадна сьвеціць.
Не варушыцца лісьце маёвых ліп.
Думаю пра безабароннасьць дрэва.
Як у юнацтве,
Бясконцым здаецца прастор прада мной.
Хтось чужы закрычаў,
Як шумеў чарот
І гнуліся дрэвы ў цёмную ноч.

2. Свае

У цёмную ноч
Перад Днём Задушным,
Калі ўжо маўчалі дрэвы і травы,
Трывожна было на душы.
Хтось пастукаў у шыбы:
— Хто там?
— Свае.
Як добра!

3. Грушавы цьвет

Як добра
Вяртацца дамоў
З далёкіх чужых берагоў.
Як дваццаць гадоў,
Як дзесяць, як год назад,
Іду па дарозе
І, як некалі,
Чую подых вясновага ветру.
Маркотна на дол
Абсыпаецца грушавы цьвет.



4. Музыка ў сьне

Абсыпаецца грушавы цьвет.
Быццам сьнег на траве.
Ледзь чуваць —
У Гаюю па каменьнях
Журліва цячэ струмень.
Мне плюскат яго так знаёмы.
Нібы музыка ў сьне.
Юны месяц
Праз кволую зелень галін
Холадна сьвеціць.

13.03—19.04.1985.

Гара, парослая шыпшынай

Дзіўна, толькі бярозы і шыпшына
Пакрылі гару —
Хіба не чуеш,
Як бразгае збруяй у замку
Устрывожаны конь?



Зянон.
1964 г.



* * *

Ранак вясеньні, вішняў цьвіценьне,
Трава маладая, жоўты падбел,
Ластаўкі кружаць
над стромкім абрывам,
Неба блакіт, жаваронкавы сьпеў.
Пахне рунь і вада
ў альховых кустах.
Вось маёвых латацяў вяночак.
Хіба можна забыць Цябе,
наша зямля!
Я ж пішу гэта
студзеньскай ноччу.

1983.



Дзень жалобы

Памяці Кастуся Каліноўскага

Устаньце, браты!
Сяньня 22 сакавіка —
Дзень Жалобы нашай.
Не кажыце ні слова сяньня.
Слухайма, як капаюць кроплі са стрэх
За тры дні да Зьвеставаньня
У Дзень Жалобы нашай.
Слухайма, як рыпяць
зьледзянелыя дрэвы
пад ветрам
У хвойных лясах
За тры дні да Зьвеставаньня
У Ноч Жалобы нашай.
Слухайма, што прарочаць героі
на плошчах
У спутанай цішыні
За тры дні да Зьвеставаньня
У Час Жалобы нашай...

1985.





Каспусь Каліноўскі.
Фота з архіва



Народны Фронт.
1989 г.
Фота У. Кармілкіна

Вербны ранак

Кветкі воблакаў — белая плынь.
Ветразь сініх нябёс угары.
Распускаецца лісце вярбы.
Узвышана сэрца, маркота ў душы.
Так вецер гуляе ў хвалях ракі.
Асьветлены скрухай, пішу для сябе,
Хоць думкі мае пра Цябе.



У Курапатах.
1988 г.

Зьвеставаньне

Сёньня Зьвеставаньне —
Дзень Бацькаўшчыны.
Але пра гэта ніхто не памятае,
Акрамя мяне.
Выйду я за парог
З хвояй пагавару.

1987 г.







Вобраз роднай зямлі

Паўдзённая цішыня.
Хвойны водар смалы і жытнёвых палеткаў.
Чую: колы рыпяць на далёкай дарозе.
Чую гукі ўгары.
То на хорах касьцельных іграюць арганы
І пяецца малітва сьвятая.
І бяздонная сінь — незямны акіян,
І аблокі плывуць над палямі.

Доля

Калі б спыталі:
— Дзе сэрца Беларусі?
Я б адказаў:
— У Вільні.
Калі б спыталі:
— Дзе сьвятасьць Беларусі?
Я б адказаў:
— У Браме Вострай.
Калі б спыталі:
— Дзе доля Твая,
Марыська чарнаброва,
Галубка мая?..
Але ніхто не пытае.

1986.

Вораг і

Ты ніяк не ўдасьцца мяне забіць.
Тады яны стрэліі ў Цябе —
І кроў пацякла з маіх ран.
Толькі ім не ўбачыць яе.
О, як вецер у соснах Тваіх шуміць!

1986 г.

Дарога

Хаваецца сонца за млын,
За ліпы старыя і сад,
Асьвятляе рудую мятліцу
На зарослай, забытай дарозе.
Медным бляскам блішчыць,
Адліваецца семем льняным
У чырвоных праменьнях сухая трава.
Не пазнаць. Зарасьлі дзірваном каляіны.
Але чуецца мне тарахценьне калёс
І званочкаў срабрыстыя бомы,
Калі сонца заходзіць за сьцішаны плёс
І цені бягуць па дарозе.
Вяртаюцца продкі з вайны і палёў,
З далёкіх краін і паходаў,
Ужо тысячу год усё ідуць у нябыт,
Ужо тысячу год усё ідуць у маўчаньні,
Агінаючы постаць маю,
Быццам камень вада,
Быццам рэха ў самотным гуканьні...
Пакуль пена з-пад млына
Сьцячэ ў акіян,
Перамелецца жыта ў жорнах.
Пакуль сонца ўзыйдзе
З-пад цемені хмар,
Ператворыцца ў цень мая постаць.

1983.

* * *

Калі на сэрцы роспачна і кепска
І блага мне і адзінока,
Іду ў Твае далёкія мясьціны,
Дзе не была нага
чужога чалавека,
Дзе вольхі і хмель
над плыньню Гаўі,
Дзе ядловец, дзіванна і кмен.
Чую сіняй варонкі крык,
Вецер птушку шпурляе,
Плынь Гаўі, плынь Гаўі
берагі абмывае...

* * *

Мілая мая!
Мо' не прыйдзе наш зорны час,
Мо' затопчацца сьлед,
Мой закончыцца бег,
Я пайду.
Ах, каб стаў я хоць іскрай
Сьвятога агню,
Ах, каб быў хоць былінкай
У полі.
Ах, каб стаў я ахвярай
Апошняму дню.
Ах, каб мог я ўзяць Тваё гора
На плечы...
Буду кропляй крыві
У пакутах Тваіх —
Толькі б з Табой
Навечна.

1983.





Вяртаюся на Беларусь

У ветраны, люты, сьцюдзёны мароз
Барвовы сьвітанак навіс над вакзалам.
Вось пад'едзе зялёны настылы цягнік,
Ах, мой слаўны цягнік!
І паеду, паеду ў сваю старану.
Не бяда, не бяда, што мяне не чакаюць.
Буду верна сядзець ля вакна.
У душы Твае песьні сьпяваць ьму.
Прыляці, прыляці, сіваронка мая.
Прыляці, прыляці, мая памяць.

1988.

Ля Налібоцкай пушчы

Чыстая сьвятліца
З вокнамі на лес.
Асеньні дзень.
Тут толькі пяць кюры.
У цішыні пішу
Пра мілыя імгненьні.
О, родная зямля!
І хворую Цябе люблю.
Зьняважаную не пакіну.
Не паміраць з Табой,
А жыць у вечнасьці мы будзем
І адбудуем наш палац,
Наш храм над возерам пад ветрам.
Гэй, напінайце ветразі, вятрыскі!
Нясіце ўсім маю любоў.







Шыльнік

Бронзаствольныя хвоі шумяць.
Жоўты лубін цьвіце пад стваламі.
Горкі смак, смольны пах
І валошкава неба над намі.

Гэй, вятрыска ўдалы!
Засыпявай над зямлёй.
Упадзі мне на вусны, ігліца, згары,
Прытулюся шчакой да карэньня.
Горкі смак, смольны пах,
У чужой старане
Вы заўсёды са мной, як збаўленьне.

Згіне холад і змрок.
Я вярнуся к табе.
Хвойны лес мой Эдэм атуляе.
Упадзі мне на вусны, ігліца, згары.
Горкі смак, смольны пах...
Ах, зямелька мая залатая!

Можа, скора памру,
Можа, й песьні сьпяяць не пасьпею.
Зашумі нада мной вершаліна сасны,
Упадзі на магілу, ігліца.
Горкі смак, смольны пах
У сваёй старане...
І валошкава неба сінее.

1983.





















Успамінаю сябра

Адабралі твае жыццё,
Калі руйнавалі спадчыну.
Нямілі крывавыя берагі.













* * *

Са мной заўсёды Вобраз Твой.
Зьмяняюцца нетры, вятроў накірункі,
Плытчэюць рэкі, высыхаюць азёры,
Зьнікаюць травы, лясы і птушкі.
Рассыпаюцца сьвятыні і краявіды,
Драбнеюць людзі —
Сыплецца пясок пад нагамі,
Сплывае вада паміж пальцаў.
Абрываецца лісьце з галін.
Паміраюць мелодыі, гукі і словы —
Топчуцца ў пыл на дарозе.
Вынішчаюцца вербы, каменьне,
А Ты засталася нязьменнай
У думках маіх, уяўленьнях,
У чыстых азёрах, у сініх лясах,
У песьнях і словах, блакітных вачах,
У мудрых абліччах, пакутах,
Сьвятых галасах —
Твой Вобраз родны ажывае
Недасягальным вечным ідэалам.

1984.

Цьвіценьне хвояў

Жоўты німб над галінкамі дрэў.
Хвоя цьвіце,
быццам сьвечкі гараць у ігліцы.
Надзяваю кашулю белую з гафтам чырвоным
І ля жыта зялёнага
йду на ўзгоркі лясныя.
Дружа мой, лес хваёвы,
Пагаворым з табой
аб сваёй старане...
Сьцелецца вецер, у соснах шуміць,
Адлятае за сінія горы.



Зянон.
1959 г.

Мама.
1959 г.

Советныя радасьці



Хвоя, асьветленая сонцам

Залаціцца прамень на зялёнай сасне.
Мігціць у іголках, бы сонца ў вадзе.
Быццам струны гучаць, быццам пчолы.
Смольны ветрык, павей у бары!
Назіраю паўднёвай парою
Прамяністую музыку хвояў.

На Прыпяці

Супроць плыні і ветру
На лодцы павольна плыву.
Прыпяць вакол.
Берагі — не прыстаць.
Хораша ўперад глядзець —
Кучаравыя сінія хмары
З ветрам бягуць над ракой.
Буслы на дубах.
Зелянее чарот.
Вада без канца і лаза.

1964—1985.

Высокі бераг над Гаўёй

Рэдкалесьсе, сухая трава.
Бязьлюдна кругом.
За стваламі відаць Гаўя.
На беразе ўсходнім —
Нізіна, лугі, вольхі кустоўе, лазы.
Не хочацца мне туды.
Адпачну на гары.
Хмары ўдалеч плывуць —
Караблі.
Вецер у лісьці шуміць.

1985.

Як добра

Як добра слухаць, што сэрца гаворыць.
Як добра пісаць, што чуе душа.
Не бяда, што яе не чытаюць,
Хто пісаць забароніць?
Хай скуюць нашы рукі,
Хай затуляць нам рот,
Чую — думкі гамоняць...
Шапаціць па кары жоўты ліст.
Клён чырвоны згасае ў вакне.
Месяц бледны ўзыходзіць.
Ты гучы, мая песьня, у зыбкім сьвятле.

1984 г.

* * *

Калі цьвілі адуванчыкі,
Так пяшчотна было на душы.
А мо гэта нашыя душы
квітнелі?
Калі сьпявалі салаўі,
Так прыгожа на сэрцы было.
А мо гэта нашыя сэрцы
сьпявалі?

Ціхі дожджык

Дождж асеньні церушыцца —
Вяла-вяла.
Кроплі віснуць —
Вішні-гольле,
Гулка падаюць на дно.
Заімшэлай студні люстра
Адбівае часу дні.
А ў ваконцы тварык ветлы
Усьміхаецца з-за шыбаў
У вясковай цішыні.

1982.

Пялёсткі

Майскі гром. Адцьвітае ігруша.
Спорны дожджык бубніць
Па страсе.
Мокне дранка,
цямнее наўкол.
Вось з-за хмар
Бліснуў сонца прамень,
Асьвяціўшы зялёны трыпутнік.
Ручайкі
ўсе ў белых пялёстках.

1981.

Летуценьні

Белыя воблакі
Адбіваюцца ў плыні Гаўі.
Цішыня. Шалясьценьне стракоз.
Гайдаецца жоўты гарлачык
У млявай вадзе.
Ні дум, ні жаданьняў.
Цяпло.
Пах аеру
Вяртае мяне на зямлю —
Спынілася лодка ў балотнай траве.

1981.

Пішу на прыстані

Апусьцілася сонца ў Прыпяць.
Плынь вялікай ракі ўсяляе спакой.
За сьпіной апусьцелы Мазыр.
Вечар летні.
Адзінокая зорка блішчыць
над вадой.
Шэлест плацьця чуваць
і хада па пяску.
Хтось у сьветлым прайшоў.
Водар тонкіх духоў.
Плешчуць хвалі ў прыстань.

1964—1985.



* * *

Калісьці мы ішлі праз асеньні лес. Быў вечар, заходзіла сонца, калі ўгары пачуліся крыкі журавоў. Мы так радаваліся, што скакалі, як дзеці.

Журліва жураўка крычыць.
Вечаровы блакіт.
Балаты.
Ці памятаеш ты?



Зянон.
1959 г.

* * *

Нічога не ведаючы пра будучы лёс,
Мы глядзім адзін аднаму ў вочы.
Усьмешка на нашых вуснах.
— Мне кепска было без Цябе, а Табе?
І мы радуемся,
Што абодвум было кепска.

Сустрэча

Усе бачаць усіх і нікога ніхто —
На вакзале пустыня
натоўпу цячэ.
Не самотна стаяць аднаму —
Прыкмячаю здалёк
у пустыні жывой
Адзінокую постаць тваю.

Бутон пялёсткаў для Евы

1

Твой позірк пяшчотна цьвіце,
Калі разам глядзім на сьвет,
Што адбіўся ў нашых вачах —
Няспыннае імгненьне шчасьця.
Няўжо яму некалі прыйдзе канец?
Не баюся.
Страшна толькі ад думкі,
Што маглі мы з табой
Не спаткацца.

2

Страшна толькі ад думкі,
Што маглі мы з табой
Не спаткацца.
Не ўбачыць сьлядоў за асеньняй імглой.
Ўжо ўслалі зямлю
Гурбы белыя ў нас пад вакном.
Не маркоцься —
Гэта ж белыя астры цьвітуць,
А ты думала — сьнег церушыцца.

3

А ты думала — сьнег церушыцца,
Калі белыя вішні цьвілі.
Ты думала — абсыпаюцца сьнежныя кветкі,
Не ўсьцярог іх для нас сьветлы лёс.
Ах, як шкода!
Але я пазьбіраў першацьвет
І прынёс на далонях да губ,
Каб ты ўбачыла:
Ад цяпла маіх рук
не расталі.





4

Ад цяпла маіх рук
не расталі
Ільды на гарах, не зьмяняецца
вішневы вецер.
Лісьце падае жоўтым дажджом
І не вернецца ўжо на ўлоньне,
І не спыніцца месяца бег —
Абыякава коціцца поўня.
Што ў вечнасьць плыве —
усё мінае,
Толькі пальцы твае ў далонях маіх
пацяплелі
І аблічча тваё расквітнела.

5

І аблічча тваё расквітнела,
І вочы, і вусны, і голас, і сьмех,
Калі ўбачылі мы ў пакінутым садзе
Адуванчыкаў жоўтых цьвіценьне.
Боскі сьвет за гарой бурштыновай.
Хтосьці нам падарыў гэты рай на Зямлі:
Кветкі, луг і блакітнае неба,
І ніводнай душы навакол — толькі мы,
Мая мілая, добрая Ева.

6

Мая мілая, добрая Ева,
Помніш дождж, вечарэла на сьвеце.
Мы стаялі пад дрэвам,
Шапацела дажджом наша хвоя.
Дзесь далёка грымела,
Бліскатала маланка, стагнала ў бары.
І пачуў я — трывожна дрыжэла кара,
Сьцерагла нашы душы.
Мы стаялі пад дрэвам дабра.

7

Мы стаялі пад дрэвам дабра.
Непадзельна ўсё, што даецца пад дрэвам.
Можа, й зорка ў нас на дваіх адна? —
Дай нам Божа.
Мне б не страшна было ў растаньні.
Я б ведаў: ты ёсьць, пакуль жыў буду я.
Мерна капае дзесьці вада.
Ужо вечар стаіць пад гарой.
Зорка шчасьця, узыйдзі нада мной.

8

Зорка шчасьця, узыйдзі нада мной,
Пакуль сонца ўстане,
Нам сьвеціць і раса
Адбітым месячным сьвятлом
У асеньнюю ноч глухую.
Уся пяшчота мая, усё каханьне
У роўным тваім дыханьні.
Але хто гэта плача? —
Зямля мая любая.

9

Зямля мая любая, —
Мая мілая, добрая Ева.
Мы стаялі пад дрэвам дабра
І аблічча тваё расквітнела.
Ад цяпла маіх рук
Твой позірк пяшчотна цьвіце,
А ты думала — сьнег церушыцца.
Страшна нават ад думкі,
Што зорка твая заімгліцца.

1982.

Музыка юнацтва

Гістэрычна ўсе крычалі.
Раптам песьня загучэла:
Плацьце бела, незабудкі,
Луг квяцісты, зорка ясна —
Гэта музыка юнацтва.

Гістэрычна ўсе крычалі.
Дзесьці песьню засьпявалі
Меладычна, чыста, ясна —
Гэта музыка юнацтва.

Гістэрычна ўсе крычалі.
Раптам двое замаўчалі
На абліччы погляд ясны —
Гэта музыка юнацтва.

1982.

Музыка

Чую гукі ў цішыні.
Гэта гучыць музыка ў маёй душы.
Гучы, мая музыка, грай
У крайне красы.
Над чорнымі хмарамі грай,
Грай у цемры начной,
Ты, нявінучы цьвет.
Пакуль сонца ўзыйдзе,
Пакуль ранак настане,
Пакуль цемра сканае,
Пакуль жыў белы совет
Грай, мая музыка,
Грай для мяне.

1984 г.





1993 г.



Адпачываю ў вандроўцы

Аблокі замерлі ў плыні Клявы.
Сасоньнік, смала, цішыня.
Летні поўдзень.

Іду пешкі

Ноч засыпела ў дарозе мяне.
Тарахценьне калёс. Галасы ў цемнаце.
Папрасіць, каб падвезьлі, ці што?



Іду між палёў

Крушні камянёў наўзбоч дарог.
Усё продкі з поля вынесьлі рукамі.
Беньзінавыя бочкі.

Купкі дрэў

Сярод чаромхі і цьвету
Раптам адкрыліся мне
на схіле
Вясковыя могілкі.

На беразе

Аднойчы ў жніўні
Я выйшаў на бераг Дрывят
І ў сьветлым люстэрку вады
Убачыў пярэстыя воблакі.
Цёплы ветрык набег —
І расплыўся адбітак у люстры вады,
Як прывід халоднае восені.

1983.

Стамленьне

Без дарог, праз палі,
па дажджы
Дацягнуўся да Браслава
ўноч.
О, гарачая капуста!
Лыжка ў руцэ дрыжыць.

Габрусь

Калісьці ў маладосьці, салодка б'ючы ногі па дарогах Бацькаўшчыны, я заблукаў у нейкую вёску і зайшоў да заможнага, шчасьлівага гаспадара, у якога было сямёра дзяцей. Праз дваццаць пяць гадоў я зноў апынуўся ў гэтых мясьцінах і зайшоў да таго ж самага гаспадара. Састарэлы, ён ляжаў на ложку адзін, хворы ў пустой хаце і пытаў мяне:

— Габрусь, ужо вечар, Габрусь? — Хоць была раніца. Ён трызьніў, што скора на машыне прыедзе Габрусь зь Вільні...

А стаяла лета. Буялі ў рост чалавека быльнёг, крапіва, лебяда пад вакном. Павалены плот, зарослыя сьцежкі. Цьвіла мацердушка. І тады я ўспомніў той далёкі дзень у юнацтве і напісаў, як было.

Заходжу ў хату.
"Дзень добры" кажу.
— Дзень добры, — вітае мяне гаспадар.
— Здравствуйте, дядя, — азваўся сынок...
Якое няшчасьце.

1.08.1987.





Цёмны хутар наводшыбе

Кіслая цьвіль і гугнявы гарбач.
І жонка прыгожая і маладая.
Драпежны позірк.

Сталоўка ў Ракаве насупраць царквы

Праз дзьверы відаць белы мур —
Брама ў памяць пра голад.
Прахалода вады на зубах.
Пах смажонкі даносіцца з кухні.

1985.





Восень у Гальшанскім замку, дзе зрабілі хлеў для жывёлы

Белая вапна
ў чорнай гразі
Пакрываецца
жоўтым лісцем.
Хіляцца вежы,
буяе палын.
У кароўнік вязуць кармы.

1985.

Ідзем з сябрам па старым вялейскім шляху

У Вялейку ўезд стары, забыты
Пахіла сцелецца наверх.
Па ім грукочуць нашы крокі
І вечар туліцца ў змрок.

Калісьці тут Ігнат Буйніцкі
З сваім тэатрам праязджаў
І Леапольд,
І Цётка Ліза...
Рыпяць фурманкі і вазы,
Мігцяць далёкія паходні
І крыкі чуюцца, і сьмех,
І палкі верш, і гуд дуды;
Звон кайданоў і звон цымбалаў
Тут помніць шлях стары, забыты,
Дзе вечар туліцца ў змрок.
Па ім грукочуць нашы крокі...

1982.

Ячменнае поле

Як добра ісьці між палёў
Па бясконцай дарозе,
Дыхаць пахам ячменю,
Калі навокал свая зямля.
Яе салодкі пыл
Так мяккa адчуваць
на вуснах.

1982 г.





Чужие гаражи



Шэрая ноч

Змрок у каменным мяшку канала.
Нізкага сонца прамень
на мутнай вадзе.
Цягнецца спаквaля
з закуткоў
Непрытульная шэрая ноч.
Вецер сьмецьцем гуляе
На брудным асфальце.

1982.

Пішу ў садзе чужога горада

І тут, у гэтым чэзлым садзе,
Дрэвы растуць,
Набухаюць, здаецца, пупышкі,
Можа, будуць на гольлях лісты?
Заблукаў нават грак з вышыні.
Гэй ты, грача-мудрэц, пан шляхетны!
А ці быў ты ў маёй старане,
Там, дзе ветрык лагодны?
...Над Гаўёй ужо дзеці бягуць басанож.
Усё, як некалі, пэўна.
Толькі я не бягу спаміж іх.

Лёндан

Бяздомная пад сьцяной.
Зімой.
Уявіў маці...





Разьвітаньне з чужым горадам

Адыходзіць цягнік ад чужога перона.
Праводзяць сваіх.
На мове сваёй разьвітальныя словы.
Махаюць рукамі камусьці ў вакне.
Патухаюць агні ў вячэрняй імгле.
Гартаю часопіс пусты.
Мяркую аб справах,
Аб нашай бядзе,
Бо ведаю добра,
Што ноч у маёй старане.
І ніхто не спаткае мяне.

1983.

× × ×

У халодным горадзе чужым
Вясной не любіс ні трава, ні дрэвы,
Не пахне ласкава, як на радзіме, бэз.
Адліваю дні і гляджу,
Як высокія воблакі
Плывуць у маю Беларусь.

1982 г.






Мой дом

Карціна маёвага ранку

Нараніцы з дому выйду —
Адуванчык у садзе цьвіце.
За Гаўёй ужо горача сонца блішчыць.
Гуд пчаліны,
Ружовая квецень груш.
Росна пахне трава ў цяні
І ветрык ледзь-ледзь дакранае шчакі.
На гары ў касьцёле ўбраным
Урачыста гучаць арганы.

Знаёмыя краявіды

Хвалістая раўніна палёў і лясоў.
Касьцельная вежа пад хмарамі.
Звон над вадой
выплывае зь юначай памяці.



Стаю на вераньдзе

Густы клён пад дажджом.
Бульбоўнік. Язьмін.
Юргіні цьвітуць.
Мокры дах.
Нікне дзень угары.
Пах сыры.
Доўга стукаюць кроплі аб ганак стары.



Май

Майскім ранкам адчыняю вакно на ўсход.
Маладая ігліца лістоўніц
мякка трэцца аб раму.
Сьпеў шпачыны,
Ветрык лёгкі гуляе.
Пах аеру з Гаўі далятае.
Паказалася сонца з-за хвой.
Заірдзелася белае гольле груш,
І цёплы прамень, як істота сьвятла,
Сьлізгаціць па ядвабнай фіранцы.
Калышацца цень на смалістай сьцяне.

Цёплы дождж

З самага ранку
цёплы-ціхі дождж ліпнёвы
Капае лена
на бульбоўнік цьвітучы.
Пах сьвінакропкі
і водар юргіні.
Буйныя кроплі з даху спадаюць
на клумбу.
У раскрытым вакне
Доўга б я слухаў дажджу шапаценьне.
Дзесьці певень сьпявае —
сьвятлее ўгары.



Час, калі цьвіце лістоўніца

Пазванілі на ймшу ў касьцеле.
Нядзеля.
Выходжу на двор.
Травень.
Сьцежкі ўсыпаны жоўтым пяском.
Цеплыня.
Пурпурова цьвіце лістоўніца.
Боская ціш.

Чырвоная гара

З Чырвонай гары
цераз сосны відаць,
Як зьмяіцца Гаўя праз Маргі-паплавы.
Над лесам далёкім лунаюць гракі.
Адзінокі ўнізе пасецца конь.
Прытулюся плячом да кары.
Пах жывіцы плыве на гары.

Еду на ровары з Суботнікаў у Васілевічы

Сьцяжынка ад ровару
Ўбіта, як ток,
Стужкай уецца,
Агінае карчы,
Мокры мох.
Сонца толькі ўзышло
Над дарогай.
Яловыя лапкі
Бягуць на мяне —
Твар і плечы ў расе.
Зь лесу выехаў.
Вось пясчаны пагорак-гара
Вецер з поля мяне сустракае
Пах сьвірэпкі
З сабою нясе.

1981.

Лістоўніца

На золку летам
Адчыняю вакно на ўсход.
Ружавеецца неба над лесам
І цёмныя вольхі
ў тумане плывуць
Над поймай Гаўі.
Не варушыцца гольле лістоўніц.
Толькі чутна,
як падае зьверху ігліца.
Шапоціць
па каравым ствале.

1982.

× × ×

Ноччу маланка пакой асьвятліла.
Дождж шапоціць па дахоўцы і лісьцях
І гулка грам грыміць
За мокрым лесам.
Цёпла ў доме маім дарэмна.

1982 г.

Куст язьміну

Вецер вячэрні дыхнуў у вакно
І прынёс у пакой пах язьміну.
Выйду на двор
І пад белым кустом пастаю
Сам з сабой у маўчаньні.
Летні спакой прывітаю
Пакуль конікаў стрэкат асеньні
Не чуваць у начной цішыні.

Цішыня

Хтось пастукаў у дзьверы.
Я адчыніў,
Але на парозе нікога не было.
Толькі нямое маўчаньне
Выпаўзла з змроку
І расплылося па хаце.
І так захацелася раптам
Добры голас пачуць чалавечы.
Але не было са мной
Ніякага чалавечага голасу.
Толькі стук гучэў у вушах
І нямое маўчаньне
Затаілася ў крэсьле.
Тады я адчыніў вакно
І заляцеў у пакой хвоі пах
І лісьця бяроз.
І цёплая цішыня,
Нібы хваля, запоўніла дом
І пасялілася ў сэрцы.

Час, калі заходзіць сонца

Там, дзе расьце палын,
Вечарам у стракатаньні конікаў
Назіраю, як холадна сонца заходзіць
За кроны далёкіх ліп.
Пад лістоўніцай жоўтай
Апошні прамень чырванее ў траве.
Горкі пах.
Соладка сэрца шчыміць.



Цёмным асеньнім днём не выходжу з дому

Квола просіцца ў шыбы сьвятло.
Дробны дождж накрапае ў сьцяну.
Точыць шашаль хаціну.
Чэзлы кактус стаіць на вакне.
Золкі вецер гайдае каліну.
Жыву ў чаканьні, што дзень праміне.



1981 г.

Слодыч маўчаньня

Цьвяток кітайкі за вакном
Калышацца пад ветрам.
Накрыўся лес касым дажджом,
Сьвятло ў шыбах меркне.
І напаўняецца душа,
Як дом вячэрнім змрокам,
Мелодыяй самоты.
І ажываюць здані дзён былых,
Снуюць, спрачаюцца, сьмяюцца
І адчуваюць горача і верна.
І соладка маўчаць,
Калі сьвятло ў шыбах меркне,
І дождж сячэ,
І цьвет кітайкі за вакном
Калышацца пад ветрам.



Верасьнёвая ноч

Месячны бляск з-за вежы
касьцельнай.
Павуціньне на ржышчы
ў шэрай расе.
Цямнеюцца вольхі
ў бледным сяйве.
Зябка стала ў даліне Гаўі.
Хутка крочу назад.
Дзесь далёка на млыне
шуміць вада.

Вечарам стаю на парозе

Восень — асіна
Лісьцем трапеча,
Холад нябесны
Маркоціць душу.
Далёка па рэйках
Цягнік загрукоча —
Падымецца дым угару.
Лес пацямнеў,
Клён адзьвінеў,
Гасьне жоўтае полымя дрэў.
Вось блішчыць ужо месяца рог.
Зарыпелі вароты ў гумне.



Сьмерць удома

Асеньняя ноч. Усё сьпіць. Цемната.
Толькі ў хаце маёй
Ярка зьзяюць агні
І прыглушаны сьпеў
У паўночнай цішы,
І сьцішаны плач уначы.
Шамацяць пад нагамі лісты.
Сьлёз жалобных стрымаць не магу
У асьветленым вокнамі
садзе пустым.

Угодкі ў верасьні

Ноччу вецер аціх.
Разбудзіла мяне цішыня.
Праімчаліся нізкія хмары.
Бледны ранак трымціць
І туман над травой,
І пара́ стаіць над папарам.
На лістоўніцы кроплі вісяць.
Пахне лубін.
Хтосьці раньні атаву ўжо косіць.
І, здаецца, гармонік вячэрні не сьціх —
Дружна пеўні ў мястэчку галосяць.
Пазіраю на ўсход,
Дзе магільнік шарэе мурамі.
Ружавее імгла над Гаўёй,
Ойча наш, дай нам сяньня... —
Дзесяць год з той пары,
Як пакінула нас Ты ўраньні...
Праляцелі гады, нібы сны,
А сапраўднасьцю душа кволіцца —
Пад вакном, дзе два дрэвы расьлі,
Не хапае адной лістоўніцы.

Шэлест асеньняга ветру

Дождж сячэ ў шыбы дробна.
Нядзеля. Дзень сьвяточны.
Вецер у садзе шуміць
мокрым лісьцем.
Птушак даўно не чуваць
І ў хаце асеньні паўзмрок.
Стаўлю пласьцінку на круг
З голасам Александроўскай.
Зьліваецца песьня з шэлестам ветру.

Студня

Ігліца лістоўніцы мяккай
западае бязгучна ў студню.
Агаляецца дрэва шкілет.
Маўкліва гляджу ўсьлед шпакам.
Тчэцца срэбраны кужаль на кроснах.
Скрыпіць калаўрот
пад сьцюдзёным вядром.
Смак гаркавай вады,
кропляў звон.
Чую: птушка малая жаласна плача.



Чытаю вершы пад шум дажджу

Сьляпы дождж у вакно несьціхана ліе.
Вечарэе, зьнікаюць абрысы,
Зьліваюцца кроплі на шкле.
Лісьце жоўтай фасолі на тычках дрыжыць,
Стыне ў шэрай імгле.
Крокі глухнуць у шэпце дажджу.
Нехта міма прайшоў ля вакна
І растаў, быццам цень на вадзе.
Чую: каўкі на вежы касьцельнай
ляніва клінчаць.
Адрываю пагляд ад радкоў.
Вые вецер жалобна ў люхтах.
І гучыць, як малітва, у душы
верш аб тым,
Як паэт памірaў
у краіне
ля бухты...

1984.

Восень удома

Прыйшла восень і абудзіла пачуцьці
ў маёй душы.
Вечарамі з-за хвояў
месяц плыве
ў цёмным вакне.
Сьлёзна ў шыбах цякуць дажджы.
Не сьпіцца ўначы.
Старэе наш дом
І ссохлыя астры
на ветры дрыжаць.
Адзываецца сьвіст
у гітарнай струне.

1985.



Іду здалёк

Увосень
Падыходжу да дому.
Вецер шуміць.
За сьпіною
Зжатае поле.
Паволі
Адзінокая
птушка
ляціць.

Ноччу ў цішыні

Месячка сьвеціць.
Зімовая ноч,
Нібы сон чорна-белы.
Марудна маўчыць цішыня.
Цень ад рамы
На сьветлай панэлі.
Далёка да дня.
Выглядаю на двор —
Дрэвы ў шэрай кужэлі.
Мароз.

1981.

Вечары

Зімой у хаце прасторнай
Зьбіраліся дзядзькі́.
Ціха сьнег апускаецца
ў ноч —
Нясьпешная гаворка.

Каляды майго маленства

Хіліцца сонца за вішневы сад,
Гурбы іскрацца ў ружовым сьвятле,
Ужо кладуцца праменьні на сьнег,
Ужо цямнее пад дрэвамі цень
І бярэцца мароз — аж трашчыць у слупах.
Конь у стайні захроп — поўны цэбар з аўсом,
І дыхнула такім чалавечым жытлом.
Грубка цёплая смольна гудзіць,
Галасы пад вакном,
Дарагімі гасьцямі напоўнены дом.

1983.



Вячэрні час

Водбліск промняў і цені лістоў
На блакітных шпалерах
дрыжаць.
У пакоях маўчыць цішыня.
Постаць твая ў абрысе сьвятла.
Адбівае гадзіньнік стук.
Назіраем, як меркнуць аблокі
ўгары.
Мне пара.
Задуменна стаім ля вакна.



Летняя раніца

Аднойчы на сьвітаньні, летам, прачнуўшыся, я назіраў каханай сон. Калі яна расплюшчыла вочы і ўсьміхнулася — узышло сонца. Тады я напісаў:

У маім доме ў вакне, як некалі,
Сонейка ўсход.
Выйдзем да брамкі
са мной.



Вечарам іду дадому

Сонца чырвонае ў ліпах далёкіх
Блішчыць з-за разгалістых крон.
Патухае.
Каней табун праляцеў на начлег.
Растварацца пыл у траве.
Летняя машкара над дарогай.
Паўз зялёнае жыта крочу дамоў
І бачу,
Як барвы нябёс
адбіваюцца ў шыбах.

Маці

Аднойчы летам сьпякотным
Мы пайшлі далёка на поўнач,
Дзе цячэ Клява.
І над вечар, калі вярталіся,
На пустой дарозе
Нас дагнала злавесная чорная хмара.
І няшчадна хвастала дажджом.
Мы прыйшлі, калі зоркі блішчэлі на небе
І спалі ўсе людзі.
Апранулі сухое адзеньне,
І цёплая печка гудзела агнём,
Нам, стомленым, грэючы страву.
Ты сказала:
Як добра на сьвеце, мой сын,
Калі маеш свой дом.
Той няшчасны, хто месца не мае.
Пахла мокрай травой за вакном
І цёплая печка гудзела агнём.

1981.

Вечарам іду праз лес
з Замаслава ў Суботнікі

Сьцяжынка.
Верас на гары.
Тут сосны і шыпшына.
Іду на захад,
дзе сонца села,
Бо ведаю — там мой дом
Пад мяккай лістоўніцай
І зялёным клёнам.
Вунь там,
Дзе на сінім небе
Блішчыць Мілавіца.
Чую брэх далёкі
За лесам.
Гэта мой брэша сабака.

1981.



Вечарам вяртаюся дадому

Сярод плынных карцін,
цішыні, верхавін,
Шуму дрэў, там, дзе сьпеў,
Між калючых ажын
Не сьпяшаюся, крочу.
Апускаецца сонца на дол.
Цераз сінія хвоі відаць касачы,
Сьпяшаюцца качкі на жыр,
Адбіваюцца цені ў люстэрку Гаўі.
Цёмна ў доме маім.
Прыйду і сьвятло запалю.



Ратуюся ад навальніцы

Лісьце парэчак над Гаўёй.
Шуміць асака.
Камары на вадзе.
Цёмная хмара ідзе.
Гром.
Ветрам гнаны,
Бягу цераз лес.
Бачу ружы ў вакне.
Дом.



На дарозе да станцыі разьвітваюся з матуляй

Мы разьвіталіся.
І я пайшоў адзін наперад,
А ты адна назад.
Я азірнуўся
І ўдалечыні ўбачыў
Тваю прыгорбленую постаць.
Ты аддалялася.
І воблакі, як сьнег,
Плылі над дарогай,
Над верхавінамі,
Над лесам.
Раптам здалося,
Што йдзеш ад мяне назаўсёды.
Сьлёзы цякуць.
І нічога не стала ў душы,
Акром моцнай віны
І бяздоннага жалю.

1982.

Дрэвы

Пакідаю свой дом.
Йшчэ зялёны мой клён.
Мой клён — гэта я.
Клён, што побач, даўно не жыве,
хоць расьце
І звоніць лістотай у нейкай тузе.
Бацькаў ясень квітнее —
няма і яго.
Толькі вецер у кроне шуміць для кагось...
Ужо сонца заходзіць за сьсечаны сад,
Ужо кліча дарога, заве далягляд.
Дажата збажына, пара і гараць.
Ах, не зрубайце ясень, людзі,
Што ж я буду ўспамінаць!?

Хварэю на сэрца

Барвянае сонца
Садзіцца за лес.
Вось бераг высокі вялікай ракі.
Без крыльляў лячу.
Мне трэба дадому.
Вось ён, вось мой дом!
О шчасьце — спускаюся ўніз
На зялёным двары,
Дзе кожная траўка
Знаёмая мне.
Вось тут я!
Вось я тут!
Стаю ля дзьвярэй
І радасьць мяне напаўняе.
Але што гэта?
У доме маім незнаёмыя людзі.
Гаспадараць!
Сядзяць за маім сталом!
Паздымалі мае абразы!
П'юць гарэлку,
Шваргочуць!
І я не разумею іх!
Яны рагочуць зь мяне,
Тыцкаюць пальцамі,
Паказваюць азадкі,
Шыпяць, як шалёныя каты,
А адзін —
Чырвоны ад злосьці —
Кінуў у мяне нажом
І трапіў у сэрца.
Мне так забалела,
Што я прачнуўся ад болю.
І не магу забыць!

1981.



Каменны
крыж
з Давыд-Гарадка
(XVIII—XIX стст.)

Аб вечнасьці і часе



Паперы

Гартаю пажоўклыя
стосы папер.
Почырк выцьвілы мой
тымчасовы.
Вось юнацкае фота,
старыя лісты —
Усё жыцьцё
праплыло прад вачыма.

Некалі даўно

У вачах стаяць людзі,
Што весела танцавалі.
І той час быў, як вечнасьць.
З гораччу заўважаю,
Як непрыкметна замкнуўся
Іх круг жыцьця.

1985.





Круг

З брамкі выйшаў хлопчык
І спытаў мяне строга:
“А куды ты ідзеш?”
Я ведаў, куды іду.
І толькі ўсьміхнуўся з пытаньня малога.
Праз дваццаць пяць гадоў
Я вярнуўся сюды
І, ідучы па вуліцы,
Прагна глядзеў на знаёмыя змалку мясьціны.
Раптам з той самай брамкі
Выйшаў той самы хлопчык
І спытаў мяне строга:
“А куды ты ідзеш?”
І я не зьдзівіўся,
Бо ўраз зразумеў,
Што крочу па крузе
Свайго пакаленьня.

На золку не сплю

Ружовае неба. Сьвітае ў вакне.
Адзінока блішчыць Мілавіцы серп.
Здаецца дзіўным і наканаваным,
Што я тут,
За зялёнымі шторамі.
Як я трапіў сюды,
летучы ў Сусьвеце?!

Вочы

Ціха грае стары патэфон,
Пачуцьцёва пяе Ізабэла.
Фотакарткі вісяць на сьцяне
І глядзяць на мяне, як калісьці,
Дзявочыя вочы і Яська-юнак
і танкісты.
Адляцела жыцьцё лісьцем жоўтым.
Адрыпелі калёсы і ворат
на студні;
Пасівелі дзяўчаты-бабулі.
Адышлі ў зямлю радакі.
Адышлі,
Як калісьці юнак і танкісты,
А дзеўчыны вочы
Глядзяць на мяне са сьцяны
І ціха пяе Ізабэла.

Цягнік

Хлопчык малы ў вагонным вакне,
Вочы раскрыўшы, глядзіць на мяне.

Праімчаўся цягнік цераз мост
І схаваўся ў вячэрняй імгле.
Быццам час, што сьпяшае насустрач сабе.

Пакуль хлопчык, як я,
Паглядзіць наўздагон цягніку,
Праімчыцца маё жыцьцё.

Адна трыццатая секунды

Выходзячы з кавярні,
Дзе торты і кава,
Бачу вузкія плечы
І тонкую шыю
Адзінокай дзяўчыны,
Што стаіць ля вакна.
Да гэтага часу не ведаю,
У чым прычына
Той балеснай шчымлівасьці.
Прайшло дваццаць год.
Не зьмянілася кавярня,
Дзе торты і кава.
Толькі тонкай дзяўчыны
Няма ля вакна.

1981.



Камета Гальлея

Даўно-даўно, яшчэ ў школе
Я даведаўся,
Што праз шмат гадоў
Вернецца да Зямлі
Камета Гальлея.
Я падлічыў,
Што можна дажыць
Да гэтага часу.
І ён мне здаваўся
Загадкавым і нязбудным,
Як і мая старасьць.
Сёньня я заўважыў,
Што засталося
Чатыры гады
Да каметы Гальлея
І не разумею,
Чаму так шчыміць душа.

1982 г.

Два крыжы

Каля лесу, пры дарозе,
Два крыжы стаяць
Спрадвеку.
Пройдзе ўдзень па чалавеку,
Шапку здымуць, паглядзяць
Ці праедуць незаўважна,
Хто прывык,
Хто проста так.

Тут калісьці доля злая
Загубіла дзьве душы.
Ды пра іх усе забылі,
Так бывае з чалавекам.
Напамінак — два крыжы,
Што стаяць вось тут
Спрадвеку.

1981.



Дрэвы Вечнасьці і перамен

Сьнег на грушах старых,
Нібы цьвет.
Толькі мёртвая цішыня ў галінах.
Але сосны жывуць зімой,
Таму чуецца ў іх
Вецер Млечнага Шляху.

Іду на спатканьне

Чорная труна выплыла з-за павароту
На плячах незнаёмых
І, нібы лодка, гайдаецца
Ў хвалях галоў.

Так нечакана,
Бо я ішоў на спатканьне з каханай
І думаў пра пацалункі.



Бярозы на ветры

Уздоўж дарог моцны вецер
дзьме.
Сярод белых ствалоў
мой шлях.
Вадаспад ля старога млына —
песьня ў лісьцях.
Пасмы гнуткіх галін, нібы травы
ў хуткай вадзе.
Вобраз Вечнасьці
ў ветры і плыні.

Валун

Адбітак ступні на граніце.
Узьляцеў матылёк.
А некалі шэры лішайнік
і гэты камень
зьесьць.



Чакаю бацьку з вайны

Я заўсёды чакаў Цябе,
Але Ты не прыходзіў.
Вусны мае сьмяглі,
Моцна балела сэрца,
І я лічыў кожны яго стук,
Думаючы пра Цябе.

Ах, як павольна цікаў гадзіньнік.
Так павольна, што я не вытрымаў
І заснуў,
Зьняможаны ад чаканьня.

Ты прыйшоў да мяне ў сьне
І сказаў казку:
"Раз у тысячу год прылятае сінічка
Да сіняга мора
І пробуе дзюбкай марскую ваду.
Калі сінічка вып'е ўсё мора,
Пройдзе адно імгненьне вечнасьці".

Я прачнуўся.
Але Цябе не было ні заўтра, ні потым.
Толькі час ляціць, як страла.

1981.



Радыяцыя



Труна

Сёньня з поўдня
Прыляцела цынкавая труна,
Напоўненая ёдам.
Не бойцеся.
Ізатоп ёду
распадаецца
праз восем дзён.

1987.



Радыяцыя-7

Там над рэчкай далёка
чаромха цьвіце.
Толькі белага квету
не бачу яе.
Сем рэнтген у гадзіну
на пыльнай траве.

1986.

Яблыня

Нібы зь вянка жалобнага,
Абсыпаецца лісьце з галін.
Пунсавеюць плады.
Наліваецца стронцыем яблык —
Не дажджэцца ўдовіна сына.

1986.





Пакінутая чарнобыльская вёска Вепрын.
1993 г.



Паўдзённы вецер

Бэзавы пах нагадаў мне,
Што май на двары прамінае.
У суседняй кватэры
хлопчык хворы
Адзін
За зачыненым пыльным вакном.

1987.



У Менскім дзіцячым гематалагічным цэнтры. Сакавік 1990 г.

Дождж

Пыл ружовы
змываецца з шыб
І сцякае ўніз па сцяне,
Дзе буяюць чырвоныя мальвы.

1987.

Субота

Горла баліць
кожны дзень.
Выбівае дыван за вакном сусед.
Стронцый у целе тлее.

Іду праз вёску

Бедная вёска.
Вымірае народ.
А пад кожным вакном юргіні.

Пыл

Як павольна спадае
пыл у паветры;
Нібы жоўты туман,
Сьвеціцца над людзьмі.

* * *

На ўсіхных тварах — гора.

Мёд

Мёдам дыхнула ў сасновым бары.
Там за хвояю грэчкі палі.
Памірае пчала ў вульлі.
Каму той мёд?

1987.

Смог

Гляджу ў люстэрка
на свой рэсьпіратар.
Што там за стук?
Сусед майструе клетку
Для чорнага дразда.

Радыяцыя-9

Яркае сонца зь нябёс
асьвятляе хвалістыя далі.
Які харошы быў
наш сьвет
калісьці.
Прагрымеў самазвал —
пыліцца стронцый
на лісьце.

1986.



Музыка воблакаў лісьцяў і траў

О папера, пяро, квет вясенні!
У час хлусьні вы надзея мая,
Вы ўцеха мая, вы збаўленьне.
Ты квітней, ты цьвіці, белы сад
прад дарогай.

Паплыву з думам хваль
У нязведаны свет,
У блакітны прастор —
Край далёкі, —
Дзе сіняць лясы,
Дзе прыстанак красы,
Дзе аблокі,
Дзе мой страчаны рай,
Дзе наш зьнішчаны край,
Дзе былі курганы і народы.
Азірнуся назад —
Паміраюць бусьлы, нібы людзі,
І зьнікаюць у засені траў.
І зьнікаюць у засені траў...

1986 г.





Радыяцыя-11

Як цяжка стала жыць на Бацькаўшчыне.
Вакол ворагі і рабы.
Толькі вецер адвечна шуміць
У лісьці пахілай вярбы.

Ты не схлусіш мне, бор і рака,
Наш хваёвы лясны далягляд.
Дзесьці звонка сьпявае піла,
Выразаюць наш вішневы сад.

Абылгалі дзядоў, апаганілі кроў,
Атруцілі здароўе і род,
Наплявалі ў студні, у душу.
Сатанінскі танцуюць факстрот.

Бог, прыйдзі!
Перацерпім, памром — прычакаем Цябе,
Станем шчыльна ў Імя Тваё.
І хоць сонца заходзіць у чорнай імгле,
Зазірае ў наша вакно.

Лік Нябесны, паўстань!
Скора, скора — ужо пры дзьвярах.
Як спакойна гляджу я на сьвет.
Ападае раса на лістах.

29.06.1986.



Вільня



Лес за сіняй смугой

Калі глядзець з палёў паўднёвых,
На фоне дальніх сініх гор,
паросłых лесам,
Ўзвышаецца Суботніцкі касьцёл.
Зірну на дзівосныя горы
ў хвойнай смузе,
І хачу растварыцца
ў тых даляглядах.
Цесна сэрцу ў грудзях
і дыханьню ў целе.
За вежамі, за хвалямі асмужаных лясоў,
За неспазнанымі гарамі,
за белымі воблакамі,
За блакітнымі хмарамі
цёпламу ветру ўсьлед
Мне мроіцца Вільня.
Чую: званы зьвіняць над жытамі,
Бачу шпілі
ў мройве зялёных хвояў,
Плыў бы туды бясконца
да чырвоных муроў.
Ах, каб крыльцы мне мець!
Мілы шпак, аднясі ёй маю любоў.

1984.

Віленшчына

На віленскіх горах,
На ўзвышшах Ашмянскіх,
Між палёў, у дарозе
Не сьпяшаю.
Павольна іду.

Прысяду на камень-валун,
Адпачну.
Аблокі ўсплываюць
З-за сіняга лёну,
Маўчу.

Нідзе не спаткаў я такое красы.
На дзесяць кілометраў — жыта згары
Гайдаецца морам,
Шумяць каласы.

О, мілы прастор дарагой Стараны!
Не хочацца верыць,
Што некалі ўмру
І болей Цябе не ўбачу.
Прысяду на камень-валун,
Адпачну.
Бязгучна ад радасьці плачу.

1981.

Там, далёка

Там, за гарызонтам, за гарамі,
За сінімі лясамі —
што там?
Мой горад,
што сьніцца ў снах.

У Вільні

У вакне касьцёл Ганны
І сьсівелы сьвятар:
Успамінае пра Беларусь.

Цьвітуць яблыні

Распусьцілася яблыняў бель.
Увайшла ў берагі Вяльля.
Пялёсткі плывуць.

Раніцой ля катэдры

Прагучэў у тумане
гадзіньнік на вежы.
Адзінокі мой крок.
Чайка крычыць
над Вяльлёй на сьвітаньні.

Віленка

Зьверху відаць:
Як лёгка дзяўчына бяжыць
Па зялёнай траве,
Дзе булькоча рака.
Выгінаецца плынь паміж гор.

Ранак на Антокалі

Холадна ўсход ружавее. Мароз.
Абсыпаецца шэрань з галін.
Патухаюць ліхтарні.
Уздымаецца сонца — малінавы шар,
Асьвятляе сьнягі на дамах.
Лунае туман над Вяльлёй.
Вось каменныя львы сьцерагуць уваход.
Прыпыняюся.
Міма іду,
Азіраюся ўсьлед
на вакно мастака —
Сергіевіча
ўжо няма.

1986.

Каўкі

О, мілая Вільня!
Зь дзяцінства знаёмыя гукі.
Каўкі начуюць на вежах касьцёлаў.
Расталі ў цемры сьпічастыя дахі.
Блішчыць мокры брук. Цішыня.
Стук абцасікаў сьпешны.
Ёкат птушак не сьціх
у мурах бернардынцаў.
Пэўна, штосьці гавораць праз сон.

Тамлюся душой

На Аміліянскім гасьцінцы ўвосень
У памяці маёй бярозы шумяць.
Як цягне мяне туды,
Дзе па сініх бруку
Пад шоргат калёс
Набліжаецца Вільня.

Віленскі брук

Бачу мокры брук праз вакно,
Адпрасаваны падковамі коней
І ступенямі продкаў.
Бачу чырвоныя камяні.
Стагодзьдзі хлістаў па іх дождж
І бег струмень
Ад Вострай Брамы аж да Катэдры.
Стагодзьдзямі цёк струмень людскі...
Прайду і я гэты шлях, як рытуал,
Памятаючы пра ўсё.

1984.

Глёрыя Патрыя

Стары дом на Людвісарскай.
Зацвітае ля брамы вярба.
Я бягущам там, перад вайной.
Чую гукі фартэпіяна
І стрэлы ў грудзі —
маім радакам.
Чую йшчу ў касцюме
Сьвятога Яна
І крокі —
Выходзіць сьвятар Адам:
Глёрыя Патрыя Рутэнія Альба,
Глёрыя Патрыя Рутэнія Альба! —
Гудзяць арганы.
Кроў на бруку,
у узлях,
на пяску,
на каменьнях —
Мая кроў,
Наша кроў
З апусьцелага дома
на Людвісарскай,
Дзе гучала фартэпіяна:
Глёрыя Патрыя Рутэнія Альба!..
Падаюць кроплі на плыты —
Гарачая кроплі з дрэў,
Што праводзілі нас
у катаржкі, у Сібір.
Прывітана будзь, Марыя,
поўная ласкі.
Прывітана будзь
Над маёй старонкай!..
Перад домам старым
Зацвітае вярба.
Глёрыя Патрыя Рутэнія Альба!
Перад домам старым
Толькі постаць мая.
Глёрыя Патрыя Рутэнія Альба!
Перад домам старым
Прагрымела вайна.
Перад домам старым
Прагрымела вайна —
Глёрыя Патрыя...

30.03.1986 г.

Фатаграфуе Ян Булгак

На патэфоне
Гучыць вясёлы пасадобль.
Што там у садзе Бернардынскім?
Цырк шапіто? Мадам Фурэ?
Ах, вішні расцьвілі?
О, Божа, колькі жабракоў
На плошчы прад катэдрай...
Якія бледныя ў іх твары.
Як рукі з голаду дрыжаць...
Мая Зямля,
Хоць крываточаць Твае раны,
Ты йшчэ багата Боскім Духам,
Бо моляцца ж, бо моляцца
За ўсіх.

20.09.1987.





Маладое аблічча.
Фатаграфія 1921 г.
(Тамара Узунава)

Факстрот

Загучэў стары факстрот.
Ах, Вільня! Вільня прад вайной!..
Кудысьці "чорна Ядзя"
па вуліцы прайшла.
Ці жыве яна яшчэ?
Дзе-небудзь.

1987.

Яблыні

Пілуюць яблыні старыя,
Кідаюць гольле ў агонь.
Дзе мае леты маладыя —
Прайшлі, сплылі, зьляцелі ветрам.
Мільгнуў у хмарах белы конь.

Каму цікавы лёс мой бедны,
Карціны памяці, гады.
Ральля пад цьветам палавее
І сьняцца замкі-гарады.

Вось па Завальнай воз грукоча.
У маім мястэчку Вільні звон.
Пілуюць яблыні старыя,
Кідаюць гольле ў агонь.

1986 г.

Узіраюся ўдалячынь

Ізноў шчыміць маё сэрца па Вільні,
Па бедным маім юнацтве.
Сінія горы на гарызонце.

1986.

Над палямі

Шчымліва так
гучыць самотны звон.
Віленскія горы,
віленскія вежы,
віленскі брук...
Далёка-далёка за небаспадам.

* * *

Імкнуся ў край бацькоўскі.
Кепска мне.
У гэтым горадзе халодным
Так томіцца душа.
Кірую на поўнач свае ўяўленьні.
І калі толькі падумаю пра Цябе,
О, Вільня,
Пра горы Твае, парослыя соснамі,
Плынь Вяльлі ў праменьнях заходнага сонца —
Лягчэе на сэрцы,
Быццам падыхаў паветрам Тваім.

2.01.1984.

Запаветнае

О, Вільня, як жывіш Ты маё сэрца.
У час спатканьня іду на пляц.
Вось мур,
Дзе апошні позірк Каліноўскага.
Доўга гляджу,
Каб панесьці з сабой у душы.

5.01.1986.



Минск





Няміга

А дзе тут Няміга была?
Ужо няма?
Хіба дарэшты жалоба сплыла
ў акіян?





Над Сьвіслаччу зімой

Жоўты водсьвет
на шэрай вадзе
Між сьнягоў.
Хмарка ружавее.

Песьні

Ля дома Ваньковіча
ў двары
Між старых мураванак і дрэў,
як тады,
Сьпяваюць шпакі
на зары.



Кельля ў доме Бернардынцаў

Малое вакно ў тоўшчы сьцяны.
Вуліца за вакном.
Даўней тут сядзеў бернардынскі манах,
Бачачы, як і я,
Глухую сьцяну прад сабой.





Непагадзь па вясьне

На Малой Бернардынскай
адцьвітае стары каштан.
Накрапаюць у мур дажджы.
Лаюцца бабы ў суседнім двары.

Старажоўка*

— Как пройти в гостиницу "Беларусь"?
— Прямо через кладбище.
(...)

Перад захадам чырвоным,
На барвяным лісьці дуба
Крывянее бляск халодны.
Ходзяць людзі між ствалоў
Задуменна ў маўчаньні.
Ходзяць кожны сам сабе —
Пэўна, восень настае
На магільніку народным,
Дзе калісьці Мнішка Ева
У семнаццаць год няпоўных
Тут знайшла свой супачынак.
Тры радкі ў мінулым краю
Не такая ўжо раскоша —
Эпітафія ў граніце.
Пабурылі, параўнялі,
Сьцежкі, ходнікі паклалі.
Сьпі спакойна, Мнішка Ева,
На сваёй зямлі пакутнай.
Тры радкі адзін я помню.
А памру —
І ўсе забудуць
Пра дзяўчыну каля млыну,
Як калісьці хтосьці, нехта
Забываўся пра Скарыну,
Пра паэтаву сканчыну,
Пра магілы продкаў слаўных
(Не ў пашане ў дзяржаўных).
Млын Мянеска на Пярэсьпе,
Валатоўка на ўзгорку
Сьцеражэ тваю дамоўку.
Зруйнавалі Старажоўку.
Сьпі сабе пад тратуарам,

---

* Старажоўка — мясьціна ў Менску ля высахлай цяпер рэчкі Пярэспы, дзе, згодна з легендаю, стаяў млын волата Мянеска, што заснаваў горад. З канца XVIII — пач. XIX ст. на Пярэсьпенскай гары існавалі праваслаўныя могілкі, дзе пахаваныя пакаленьні менчукоў і вядомыя дзеячы Беларусі. Могілкі зьнесеныя ў канцы 40-х — пач. 50-х гадоў гэтага стагодзьдзя. Цяпер на тым месцы высотная гасьцініца "Беларусь". Пры яе будаўніцтве і пракладцы дарогі ў 1985—1986 гг. адбылося масавае рабаваньне магілаў.

Пакуль ява стане марай,
Ева Мнішка,
Зь лёгкай парай! —
Цеплатраса побач ляжа.
Раскапаюць, адкапаюць,
Крыж нацельны разламаюць,
Косьці, рэбры раскідаюць,
За бутэльку чэрап сплавяць
Дзе-якому снобу-падле,
Засьмяешся на паліцы
Сярод мэблі рэтраграднай.
Прадаюцца косьці Евы!
Гэй вы, хлопцы-камсамольцы,
Аўкцыён на Старажоўцы!
Гэй вы, хлопцы-незабойцы,
Пагандлюем барахольцам!
Бот салдацкі,
Лямкі з ранца
За трусы — амерыканцам.
Ордэн славы, медалі —
Немцы з ходу ўзялі.
Прадаюцца нават кулі,
Што па сэрцу паласнулі...
Дзе калісьці дом Мянеска
Красаваўся каля места
Перад захадам чырвоным,
На барвяным лісьці дуба
Крывянее бляск халодны.
Дзень канчаецца пагодны.
Ужо цемра настае.
Цемра — цемра без прасьвету...

1987.



Зорка Максіма



Упершыню ўбачыў

Месяц над морам —
серабрысты шлях.
Струны гучаць —
вобразы Танідзакі.
Успамінаецца Багдановіч.

“Даўно ўжо сэрцам я хварэю”

Скрыгоча рыдлёўка.
Некалі і я лягу ў такім жа пяску.
Толькі на маю магілу
Ніхто не прыйдзе.
Бо нікога ў мяне няма.
Але я не бядую.
Мне няцяжка будзе ляжаць
У Тваім улоньні,
Мая добрая, каханая мая Зямля.
Думаю часта,
Чаму ж ты няшчасны,
Максім?

4.07.1987.

Максім

На прадвесьні
загараецца зорка
ў небе.
О, колькі надзей у Максіма!
Рыпіць пад галёшамі сьнег.

Зімой у марозную ноч гляджу на зорнае неба

У марозную ясную ноч,
Калі ўсё сьпіць
І цішыня на сьвеце,
Паслухайце,
Як шалясьцяць зоркі,
Быццам крылы страхоз.
Гэта шэпат Вечнасьці,
Дзе кожная душа
Мае сваю зорку.
Я так углядаюся, слухаю —
І не знаходжу.
Толькі шэпат,
Быццам крылы страхоз,
І цішыня на сьвеце...

1981 г.

Успамін пра Багдановіча

Гэты шлях,
На ровары прамераны
ў юнацтве,
Мне пешшу дарагі.
Вось ручаіна
і зьдзічэлы бэз.
Тут некалі была сядзіба.
Ніхто не помніць тых людзей.
Усё зарасло травой
І памяць заплыла гадамі.
І толькі грушка,
Што расьце ля крушні,
Гады не лічыць,
Старой усё адно.

1981.



Праз 25 гадоў успамінаю вобраз вячэрняй пары

Захад асеньні.
Пустое бульбянішча.
Шолах альховых лістоў.
Счарнелая груша.
Юргіні памерзьлі.
Сад апусьцелы. Халодны Пакроў.
Гляджу з-пад рукі
на апошнія промні.
Загараюцца ў хатах агні.
Пралятае юнацтва маё,
быццам хмары.
Зірні, мая зорка, зь нябёсаў,
зірні.

1959—1984.



"Я не самотны..."

У Ялце
Толькі Тваё быцьцё
напоўнена сэнсам,
Максім.





Месяц

Ужо цямнее на двары —
Памірае дзень вясеньні.
Зноў ляжу на ложку белым
Той жа дом і тыя ж сьцены,
Тое ж неба за вакном.
Хутка ўзыйдзе месяц ясны.
Вось зьявіўся, як у казцы.
Будзь здароў, мой срэбны дружа!
Будзь здароў, мой сябра верны!
Будзь здароў, мой адзінокі,
Пасьвяці на ложак мне,
Мо' не раз яшчэ ўбачу
Бледны твар твой у вакне.

12.03.1983.

Хвароба

Цямнее неба ў маім вакне,
Змрок кладзецца на прасьціны мае.
Не відаць на тэрмометры крэскі
І губы гараць ад смагі.
Ціха ў доме пустым.
Толькі трошкі трывожна.
Кружацца, кружацца сьцены
І гайдаецца мой карабель.

1982.

Нямы дом

Паволі цягнецца час у разьбітым маўчаньні.
Чую толькі крык тэлевізараў
І гарачае сваё дыханьне.
Млосна.
Вечарам здалося, што апусьцілася столь нада мной,
Трэснула немата.
Зьверху, зьнізу, з бакоў
У доме нямым
Жывуць людзі.
Не ведаю нават іх абліччаў
І ніхто не ведае пра мяне.

25.03.1984.

Імгненьне

Вочы заплюшчыў і, быццам праз сон,
Бачу вобраз былы.
Летні дзень.
Вось мой дом з-за Гаўі.
Хтось па лузе ідзе мне насустрач.
Пазнаю, як было —
Гэта добры мой сябра ідзе.
Вочы ўзьняў —
Белая столь нада мной.
Мой усьмешлівы сябра
Даўно не жыве.

25.02.1984.

Восеньскай ноччу

Ізноў вярнуўся час хвароб у цішыні.
Павіс дажджлівы лістапад.
Шалясцяць за сцяной вятры —
Абрыўкі газэт на балконе.

Ізноў хварэю

Гарыць у грудзях.
Так млосна ў цішыні.
Хтось пяе за сцяной
пра любоў.





У Вялейцы

Часовае прыстанішча ў дарозе
Стала маёй пасьцельлю шпітальнай.
Цьмяныя шыбы —
Мой позірк у сьвет.

Воблакі белыя
ў вакно прыплываюць,
З вакна адплываюць.
Цікае гадзіньнік ля скроні
На гарачай маёй руцэ.

1982.

Келіх

Улагодзіўшы думкі мае,
супакоіўшы боль,
Ты пайшла.
А вобраз твой мілы
Стаіць цэлы дзень ля вакна,
Пакуль змрок спакваля
Не сатрэ яго з шыб.
Аддаляецца голас ад сьцен,
Вяртаецца ўсьлед за табой,
Прачынаецца боль у грудзях —
Не бяда:
Дачакаюся дня.
Келіх з горкім лякарствам
стаіць на стале.
Скора вып'ю яго да дна.

1985.

Ізноў вярнулася журботная пара

Праляцелі летнія дажджы,
З вясёлкамі хмары сінія,
Адцьвілі яблыні і белыя ружы,
Адкрасавала жыта.
Ізноў баліць маё цела
І сячэцца ў шыбы імжа.
А ноччу, калі вецер асеньні
аблокі разьвее,
Месяц глядзіць у вакно.
Пахне лісьцем апалым
і мерзлай травой,
Льецца срэбны прамень
з-за вішнёвых галін
І журботна сьпявае душа,
зьнемагаючы боль.
Прыйшоў час летуценьняў у мройным сьвятле,
Час хвароб, час шчымлівы.
Балесна і соладка мне —
Забыць не магу аб далёкай вясьне.

1984.

Ляжу ў шпіталі

Ля вакна прайшоў чалавек —
Панёс на руках дзяўчынку.
Сіняя стужка ў галоўцы льняной.

1986.

Шуміць вецер

Ноччу зімой
Хворы, у ложку шпітальным,
Я ўспомніў,
Як некалі ў жніўні
Шумелі на возеры хвалі.

1986 г.



Думаю пра Еву

Раней — захварэю,
І ты прыходзіш
ласкавая.
Цяпер — нікога няма.

* * *

Горача кружыцца галава,
халадна ў целе.
Расплываецца цьмяна ў вачах
гравюра.
Узор на шпалерах бяжыць
у бакі.
Страху няма ў крыві —
буду жыў.
Лёгкі шум у вушах.
Гэта лісьце шуміць уяўленьняў.
Калышацца белая штора.
Сьмягну
і думаю пра харaство.

1984.

* * *

На сёмы дзень хваробы, вясной,
Гляджу ў вакно:
Толькі яркі блакіт, чысьціня,
пустата
Супакойваюць стомлены дух.
Сакавіцкім зьвініць капяжом
звон касьцельны.
Чорная птушка плыве
ўдалячынь.

1983.



Паганскі дух

Жаўна

У бляску сонца на заходзе
Веснавога дня
Усплыў на небе месяц срэбны —
Вока Пяруна.

Закацілася за поле
Вогненнае кола,
Затурчэла ў цёмным лесе
Птушачка жаўна.

Мо не птушачка туркоча,
Мо сасна рыпіць?
Мо душа жывая продка*
Са мной хоча гаварыць?

1981.

---

* У народзе лічылі, што, калі на Дзяды рыпяць, дрэвы, гэта гавораць з таго сьвету душы памерлых. — *Аўт.*





Закляцьце

Ноч за вакном.
Месяц чырвоны.
Музыка грае.
Сум на душы.
Моцна заснула
Зямля дарагая
Кроплі расы
На магільным крыжы.

Выйду на двор —
Цішыня над ракою,
Белы туман над вадою ўстае.
Пах палыновы,
Бераг лазовы,
Шэпчуцца словы мае.

Ты плыві, наша гора,
У сіняе мора.
Хуткай вадою плыві,
Птушак, звяроў
І людзей, што паснулі,
Стогнам сваім не будзі.

Ветрык павеяў,
Усход палавее,
У лес апускаецца ветах нямы.
Чорны глушэц моцна крыльлем залопаў.
Падаюць кроплі расы...

1984.

Гарадзішча

Жнівеньскі вечар.
Жоўтыя блікі на лісьці крушыны,
Звон камарыны,
Туман над балотам,
ліловай вадой.
Па каменьнях зялёных
струменьчык булькоча.
Дымам пахне ў паветры —
Будзе ноччу раса.



Запусьценьне

Гучыць калыханка ў доме пустым
У запісе, праз рэпрадуктар,
Над калыскай пустой.
Уліваецца ў шыбы
З асеньніх палёў чорны змрок
"— А-а-а, каткі два..."
Масьніцы рыпяць.
Гэта што там за цень у вакне?

Русалка

У яры ў даліне
Крынічка цякла,
Рабіна цьвіла.
Там дзеванька міла
Белы ручкі мыла,
Ваду замуціла.

Йшоў хлопец напіцца
Вадзіцы тае.
Чакай, мой хлапчынка,
Зірні на мяне,
Пакуль вада стане,
Рабіна цьвіце.

Пакуль вада стала,
Крынічка ссохла,
Рабіна апала.
У яры глыбокім
Русалка сьпявала,
Хлапца шкадавала.

1982.







Звон

Я заблудзіўся ў лесе незнаёмым,
Ды загучэў касьцельны звон
Далёка ў веях ветру.
Дзесьці там, за сіняй градой,
Куды сплываюць аблокі
Белыя, нібы сьнег.

Гучаньне анёльскага голасу

У цішы над Зямлёй
У эфіры начным
Голас жаночы гучыць:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... —
Чысты, як срэбны струмень
на радзіме,
Як сонечны бляск
у крынічнай вадзе. —
Авэ, Марыя, грацыя плена...
Беражы, сьцеражы нас
у чорнай бядзе.
Да прыёмніка вухам прынік
Я далёка ў лясной старане,
Там, дзе сосны шумяць
пад дажджом,
Там, дзе хмары бягуць
над вадой.
Авэ, Марыя, грацыя плена...
Гучыць над начною Зямлёй.

1987.



Куранец

Воблакі...
Раскрытая столь
Старажытнай царквы.
Воблакі...
Бяроза на гзымсе расьце
Старажытнай царквы.
Воблакі...
Чорная сажа
На белай сьцяне.
Воблакі...
Сыплецца чырвань цаглін
На алтар...
Воблакі хутка плывуць
У раскрытую бездань нябёс.

1983.



Касьцяневічы

Летні змрок надышоў,
Цёплы дождж накрапае.
Апусьцелы зялёны цьвінтар,
Белы гмах і закрытая брама.
На душу навявае спакой
Харaство незнаёмай мясьціны.
Сад за мурам
І сьлівы растуць, і рабіны.
Ксёндз памёр.
Адышоў стары ксёндз...
Яшчэ чыста вакол і прыгожа,
Шапаценьне дажджу, пах язьміну.
Хтось расейскую песьню
п'яную запеў,
Бачу: людзі ідуць з магазіну.

1983.

Холад

На Вялікадня выпаў сьнег
І схаладаў прастор.
Не маркоцьцеся.
Сьнег вясновы, што агонь,
Ён гартуе млявы дух.

Полацак

Зьвіняць званы
Сьвятой Сафіі,
І піша Слова
ў кельлі сьветлай
Малады манах.

Цярпеньне

На беразе магілы
Разьвіталіся два сябры.
Скаціўся адзін уніз,
Застаўся другі.
Чакае сваёй чаргі.
Толькі плыла хмара
І зышоў зь яе сьветлы Анёл
І сказаў таму, што застаўся:
— Чаго стаіш на беразе?
Паглядзі на краіну магіл,
Хіба не бачыш, што ты жывы!
Адышла хмара.
Але яшчэ і сяньня
Стаіць над магілай самотная постаць,
Раздумляе над словамі зь Неба.

1987.

У старой царкве

Гістэрычная песьня,
азлоблены крык —
Шалёна хрыпіць транзістар.
Машыны гудуць за сьцяной,
галасы...
Ціха ў царкве, прахалода,
паўзмрок.
Сьвецяцца лікі сьвятых.
Пяць стагодзьдзяў глядзяць
з царскай брамы
Праз адкрытыя дзьверы
ў сьвет марнаты.



Homo pulcher

У касьцёле Божым цішыня,
Зіхцяць дрыготкія праменьні.
Які прыўкрасны чалавек,
Што на каленях у маленьні.
І позірк чысты, і пакора...
І поўны дум прыгожых...,
І хор гучыць..., і Востра брама...,
І гуд узвышаны арганны...
Як бляск маланкі асьвятліў
Твой даўні-даўні вобраз, мама —
Мяне маленькага ў касьцёл
Вядзеш за ручку рана-рана.
Гуляе ветрык залаты,
Пласкоча бэзавае лісьце.
Найшчасьлівейшы час зямны,
Прыйдзі ў жыцьцё маё — вярніся.

1986 г.



Багародзіца.
Абраз XVII ст.
Давыд-Гарадок

Сьветлы касьцёл

Сьвятая імша
і сонечны дзень.
Прасьвятлі нашы душы, Госпадзе!
І гімн Беларускі гучы!
У сьветлым касьцёле, мілая,
Ты побач
укленчы са мной.



Грамніца

Мне сьнілася цішыня,
Калі ноччу глухой прачнуўся.
Шыбы трымцяць,
Вецер вые ў кустах,
Завіруха гудзіць,
Гайдае фіранкі на цьмяным вакне,
Сыпле сьнегам густым,
Незакрытыя дзьверы рыпяць
У пакоях пустых.
Духі злыя ў доме маім
Свой спраўляюць шабаш.
Прэч, касматая чэрнь! —
Я не сплю.
Прэч з сьвятыні маёй!
Запаліўшы грамніцу, устаю.
Ты сьвяці, не згасай, ачышчальны агонь!
Буду моцна трымаць я грамніцу ў руцэ,
Пакуль сьветлае раньне ідзе,
Пакуль цёмная ноч праміне.
Капае воск на далоні мае.

1984.



Фатаграфіі

Сасна

На фоне нябёсаў сасна адзінока стаіць.
Ледзь чутна ў хвоі вецер шуміць.
Вечнасьць.

Ружа

Адцьвіла ружа на сьвітаньні.
І апалі пялёсткі ў цішыні.
Раса.





На беразе Гаўі

Гарлачыкі ў засені вольхаў,
Дрыжаць на цякучай вадзе.
Ледзь галінку крануў —
плотка мільгне.

Цёплае лета

Заснуў на траве.
Прачнуўся —
Аблокі плывуць...

Летам

Бісер кропляў на лісцях
брызгелін, рабін.
Ціхі дожджык завіс
у галінах крушын.
Цеплыня.

Маёвай парой

Белая яблыня ў ценю
муроў.
Патухаюць вячэрнія промні.
Сьвеціцца цьвет.

Цьвіце гарох

Якое дзіва:
Мільён ліловых матылькоў!
Гарохавае поле.

Родны від

Здалёку відаць была груша над пуняй.
І вось навальніца
зламала.
Не магу зьмірыцца.

Неўласьцівасьць

І гэтую бочку з мазутам
Дожджык абмывае,
Як сотні гадоў назад
Пры дарозе каменьне.

Месячнай ноччу

Гужы рыпяць.
Месячны бляск асьвятляе дарогу,
Но, гнеды, но — размаўляю з канём.

Чэрвень

З усіх бакоў таполі пух
Ляціць пад шолах траў
І цёплы вецер.



* * *

Паветку адчыніў.
Лагодна зарыпелі дзьверы.
Пах сена.

Сажалка

Паўдзённая сьпёка.
Гусь выплывае
на люстра вады.
Растуляецца раска.

Некалі на Браслаўшчыне

Ля старога млына
Курыць люльку млынар.
Нават вейкі ў муцэ.



Канчаецца лета

Конік квола стракоча
ў жоўтай траве.
Адцьвілі сухавейкі.
Жнівеньскі вецер.

Гудок

Як шчымліва
між сініх лясоў
Заціхае гудок цягніка.
А здаецца ж — машына.

Еду аўтобусам

Скрозь дрымоту ў вакне
Мільгаюць жоўтыя кусты.
А можа — сны?

Мінае лета

Дымнае паветра.
Сухая трава, кавалёк.
Вось і па леце.

Асеньні матыў

Імчыць струмень —
пясок і перлавіцы.
Як цяжка позірк адарваць
Ад плыні дум міжвольных.

Асеньні шлях

Месяц праз жоўтае лісьце
глядзіць,
І вецер шуміць
па дарожным пяску,
Падымае пыл.

* * *

Прасьветленая маркота восені.



Орша

Пад'язджаем да Оршы.
Чуеце веліч
У ветры на полі?

1987.

Ула

Што гэта? Ула?
Звычайная рэчка,
А якая слава.

1987.

Раніца

Пасьля начнога дажджу
Вада ў лілеі
Чыстая, нібы раса.

Люблю, калі ўсё цьвіце

Пышна зацьвілі вішні.
Толькі кароткая іх пара.
Не пасьпеў наглядзецца.

Гаўя

Вярба нахілілася гольлем у плынь.
Ловіць пены кісель.
Гуляе платва.

* * *

О, мой краю, сьветалюбны.

Лубін

Цераз шум ветравы,
Цераз лясцевы бісер бяроз
Назіраю, як лубін цвісце.

Кавярня

У кавярню зірнуў і заўважыў:
Чыйсьці сын малады за сталом
Прагна дым тытунёвы глытае.



Бачу, як дзеці гуляюць з сабакам

Сабака разумны —
гаспадарскую шапку нясе,
Але чалавек разумнейшы, —
Сказаў Віцька.

Праз 15 гадоў пасьля сьмерці Лявона Баразны

Мы ўжо равесьнікі з табой.
Ніякіх перамен
І трэба так сьпяшацца.

1987.



Памёр чалавек

Плач вылічальны. Адчынены дзьверы.
Сьлівы цьвітуць.
Маўчу.

* * *

Дарога кветак.

Серабрыстая ноч

Выйшаў да мора
ў летнюю ноч
І не магу вярнуцца.
Вялікі месяц.

Мінуў дзень нараджэньня

Яшчэ ўчора — мае нарадзіны.
Так пуста ў доме —
Паніклы нарцысаў букет.



Бяссоньніца ў вясновую ноч

Што за таемнае дыханьне?
Гэта груша цьвіце ўначы.
А мой сусед бязбожна так храпе.

Травень

Жабіна цыбуля на кудры старой
Ужо прарасла.
Холад вячэрні плыве.

Абсяг

Крушні ў жыце,
Нібы караблі ў моры.
Пад хмарамі хвалі бягуць.

Поўдзень

Як хораша!
Жыта красуе
На ўскрайку сасновага бору.

На будоўлі

Якая прыгожая дзяўчына
Месіць цэмент.
І ніякага выхаваньня.

Вясковец

Гэй, хлопец,
Лепш гараў бы зямлю,
Калі хочацца так кіраваць!

Летняя ноч

Што за добрыя гукі
праз сон уначы?
Лісьцяў пах?
Дожджык накрапае.

Цёплы ліпень

Парослая мохам паля,
бруіцца вада.
Бязгучна ляціць страказа.
Стары млын.

На беразе мора

Верабейчык цікаўна
мяне разглядае.
Хоча есьці?
Чую: крыльцы трапечуць
у шуме прыбою.

Гукі дажджу

Капае дождж у вакно
Цэлую ноч.
Так прыемна заснуць не дае.



Сьвяты дзень

Жаўранак над травой.
Ветрык.
Калышуцца коцікі.

Сустрэча

Туфлікі па паркеце...
Паварочваюся —
Твая ўсьмешка.

У Івянцы

Сьветлы касьцёл
і сьвятая імша,
І Боскі гімн па-беларуску.
Памалюся я за сябе
і цябе.





На маладзіку

Сёньня месячка на небе
ражок малады.
Дожджык церушыцца.
Нічога не бачна.

Белыя лебедзі

Дзе лебедзь зь лябёдкай плылі,
Набягаюць на бераг азёрныя хвалі.
Толькі нас
там ужо
няма.

Мілавіца

Над зарывам сьвітаньня
Зорка раньняя гарыць.
Прачніся, любая, прачніся.

Ліпея

Мінула лета —
І засталося ў памяці,
як сон:
Твой сьмех,
твой пах
і белая ліпея.

Зьбіраю кветкі

І навошта мне гэты букет,
Калі ты так далёка?
І нават ня ведаю —
ці памятаеш пра мяне?



Разьвітаўся з каханай

Набягае дарога,
за сьпіною агні.
Твае пацалункі
на вуснах маіх...
Заўтра вярнуся.

Аднатыпнасьць

Маладая ў вэлюме белым
маўчыць.
Бледныя пальцы на чорным
бастоне.
Нібы пахаваньне.

Вечарэе

Стары цьвінтар,
Надмагільлі без эпітафій.
Сонца заходзіць у зарасьніку малін.

Выган

Вецер калыша пасохлы асот.
Асеньнія дні.
Пакрышкі старыя ляжаць.

Люцінка

Пустыя палі. Вараньнё.
Рыкае карова ў двары.
Канчаецца лістапад.



Цямнее

Затрапятала асіна
ў сасновым бары
Вечарам у цішыні.
Йшчэ ружовяцца хвой верхавіны.

Удалечыні

Месяц на чужыне
Сьвеціць мне ў вакно.
Як далёка
да маёй Бацькаўшчыны.

Родныя
сьцены

Гравюра на сьвяце,
Як некалі, калі пакутваў,
Нязьменна вісіць.



Трывога

Сабака на ланцугу
ўначы
Так жаласна вые
пад ветрам.

Даганяю страчанае

Ужо сарока прастракатала.
Азірнуцца няма калі,
Вырваўшыся з-пад капытоў.

Ідуць дні

Распускаюцца вішні,
Як быццам учора.
А ў сябра белыя валасы.

Ападаюць лісты

Бачыў штодня па дарозе,
Як груша старая
лісьце скідае.
Сёньня — чарнеюць сукі.

Рэчка

Цячэ рэчка праз жыцьцё
І хвалі хаваюцца ў часе.
Булькоча вада на малых камушка́х.

Слухаю дрэвы

Якое сіняе неба між ліcьця!
Чую сасну ў цішыні.
Бярозу — на ветры.

Добра пісаць

Багаслаўленая пара.
Чысты стол, цішыня і папера.
Прыслухоўваюся да душы.



* * *

Сябры — у маладосьці.
У старасьці —
сам з сабой.

Вішні

Ніхто не глядзіць,
Як хораша вішні цьвітуць.
Няўжо на ягады спадзяюцца?

У красавіку

Кроплі зьвісаюць з голых сукоў.
Дробненькі дождж
абмывае счарнелы пыл.





Ад'язджаю цягніком

Адплывае ўдалеч мая Зямля.
Цьвітучыя сосны
бягуць за апошні вагон.
Дым.

Першы сьнег

Пасьля асеньняй гразі
Сьнежная чысьціня.
Апошнія астрос нясуць.









Танга над Гаўёй

Танцы на мосьце
У месячным сьвятле —
Як даўно гэта было.

Перамена

Першы сьнег.
А ўжо сьлед пратаптаў
Нездаволены кот.

Ліставей над Гаўёй

Толькі вецер падзьме —
І градам з алешын ляцяць лісты.
Нядоўга плывуць па рацэ.

Стары млын

Даўно няма ні ставу, ні мастоў.
А шум вады ў памяці
Так сэрца суцяшае.



Крумкач

Высока лунае крумкач:
Як сьвет перамяніўся —
Поле да небаспаду.

* * *

Вось лес — народа лёс.

Змрок у падсечаным лесе

Зарыпела сасна ўначы.
Чыя гэтак стогне душа?
З падсочак плыве жывіца.

* * *

Ідучы пехатой па старым гасьцінцы, за ўвесь дзень не спаткаў чалавека. Тады я напісаў:

Нідзе ні душы.
Толькі машыны пыляць.
Сьпяваю адзін на дарозе.

Раніцой іду праз луг

Павуцінье пад сонцам блішчыць.
Якая халодная раса ў жніўні!
Узьлятае з-пад ног перамоклая моль.

На пероне

Пачуўся гудок за ліпамі.
Дзяўчынка малая
ляльку калыша —
Сьпі, мой сыночак, сьпі.

Нядзельны ранак

Раніцой у нядзелю
на вуліцах пуста.
Адзінокі аўтобус імчыць.
Чорны сабака
з лужыны хлебча ваду.



Іду праз могілкі

Сонца парыць.
На ссохлых вянках
Зялёныя мухі.

Дома перад навальніцай

Чорная хмара з усходу ідзе.
Злавесна прыціх абсяг.
Надрыўна ў шыбе зьвініць аса.

На сьвітаньні

Якое чырвонае неба на ўсходзе.
Залоціцца кніг пераплёт,
Дзе напісана,
як зьменіцца
ўсё на Зямлі.





Іду па Вялейцы

Вялікая плошча. Брук.
Сонечны бляск верасьнёвы.
З-за блакітнай царквы
чортава кола відаць.

Зімой

Павольна з шыферу спаўзае сьнег.
Хтось фіранку крануў.
Мільганула рука ў вакне.

Сон пад ветрам

Цэлую ноч без канца
Стукае ў раме шкло.
Вецер шалее на хвалях Дрывят.

Далёкі вобраз

Каптанік бабулін зусім абнасіўся.
Столькі год прамінула...
Ідзе па сцяжынцы дамоў.



Прачынаюся

Што гэта? Нібы скрыпка гучыць.
Абудзіўся —
у вакне
Падымаецца сонца над лесам.

Прысады

Пад бярозамі, дзе пяюць салаўі,
Жаўцее акацыі мора.
Далёка цягнік грукоча.

Крым

З высокай гары —
мора за небакрай.
Тыя, што застануцца жыць,
Убачаць тое самае.

Гурзуф

У татарскай саклі
П'яны Іван.
Ніводнага татарына.

Чытаю паэзію новых формаў

Ну што ён так
доўга піша
Пра струны і росы?
А яшчэ японец.

Напамінаньне

У сябра няшчасьце —
маці памерла.
Цэлы дзень маўчу.

Прамінаньне

Жаўціцца сьвятло, нібы воск.
Як хутка сыплецца ліcьце
Верасьнёвым марозным днём.

Сьцежка

Засьнежаны парк.
Па дарожцы бязьлюднай
Хлопчык ідзе.

Старая
печ

Печка гудзіць —
бярозавым дровы.
І маркотка стала мне,
Што не вернецца былое.

Галубы

Праз шыбы зірнуў — белы сьнег.
Восьмы паверх.
Галубы ляцяць.

Стары Івянец

Дыханьне каня
На торбе з аўсом заінела.
Марозны дзень.



Год за годам

Мінае вясна і травень
Скора, як дым на вятрыску,
Толькі старыя сябры
застаюцца са мной.

1988.

Адзінота ў верасьні

Куды адлятае гудок
вячэрняга цягніка?
Пад асеньнімі хмарамі
Растварaецца дым
над палямі.

Жнівеньскі дзень

Зайшоў у кавярню няўзнак.
Выйшаў — аж мокры асфальт.
Пералётны дожджык.





Капуста

У лісьцях капусных
ірдзіцца раса.
О, і капуста харáство!

Певень

Нібы дзяркач,
так перамок чырвоны певень
Пад ліўневым дажджом.
Якія ўжо там куры!

Пасяліўся ў гасьцініцы

Нясьцішны дождж на вуліцы.
Як добра засынаць
Пад пах язьміну.

На рынку

Пацеркі з ракушак?
Не для каханай.

Флёксы

Цёплай ноччу пад вакном
Флёксы белыя цьвітуць.
О, юнацтва!



Ноч на дваіх

Крапае дождж ык на шкле,
не сыціхае.
Вось не думай,
Што бывае кароткай
асенняя ноч.

* * *

Калі я прыехаў сюды зноў, мне сказалі, што мой сябра даўні — аматар флёксаў і юргінь — ажаніўся і цешыцца з жыцьця. Тады я напісаў:

Як усё перамянілася.
Там, дзе ружы некалі цьвілі,
Расьце цыбуля
ў суседа на двары.





Старая фатаграфія.
1910 г.
(Зоська Верас)

Народнае сьвята

Танцуюць кадрыль на траве.
Шалясьціць у крухмальных кашулях дзяўчат
маладосьць.
Дзед стары ўспамінае былыя гады.

Кастрычнік

У дзень будзённы
ў цішыні
Праз вецер за сьцяной
аркестр зайграў
Жалобны марш.

1988.

Брудная вайна

Ніколі дарам не міне
Забітых кроў,
нявінных.
Без пакаяньня...
хоць бы заплакаў
хто-небудзь.

1987.

Вайна

Адчыняюцца крамы насьцеж.
Заходзьце, народ. Бярыце ўсё.
Душацца ў дзьверы.

1987.



Сакавік

Ужо сонца растае ў цёплым святле.
Як стукае маё сэрца.
Грудзее смала на рочках сасны.

Вішні-I

О, вясновыя вішні!
Задумалі вы плод пунцовы,
Бо люба белае цьвіценьне.

Сьветлы травень

Сьвітаньне ў вакне маёвае.
Ветрык павявае.
Вольная Беларусь.

* * *

Песьня мая,
Будзь мне
ласкавай.

1982.

* * *

Я даўно зразумеў,
Што хоку —
Гэта фатаграфія.
Фатаграфія, якую
Можна пісаць пяром.





Прыпавесьці



Брама

Я спыніўся перад брамай,
Дзе коньнік збройны зь мечам
Сьцярог невядомасьць.

Мяне ўразіла
Безьліч безыменных магілаў
Перад бясконцым мурам.

Я падумаў, што гэта могілкі,
І пайшоў праз браму,
Каб паглядзець і вярнуцца.

Я не памыліўся.
Гэта былі могілкі.

Там я ўбачыў крыж
Са сваім прозьвішчам,
Без эпітафіі.

Ля крыжа сядзеў чалавек,
У якім я пазнаў самога сябе.

"Чаго ты прыйшоў сюды
З пустымі рукамі? —
Спытаў мяне нездаволена я, —
Месца тваё перад брамай".

Я падаў мне руку і сказаў:
"Здароў будзь, Зянон.
Што ж я магу прынесьці сюды,
Акрамя сваіх рук?"

І мы пайшлі, каб вярнуцца,
Бо кожны зразумеў,
Што няма чаго там рабіць
З пустымі рукамі.

1981.



Заслона

Я сьпяшаюся.
Доўга бягу па дарозе.
Бясконцым здаецца мне шлях.
Наперадзе мэта і сэнс.
Ззаду схіл і россыпы камянёў.
Я ведаю, што ўсё залежыць ад хуткасьці,
Бо адмераны час, а колькі яго — невядома.
Не разглядаюся, каб не марудзіць.
Кідаюся ў бакі, каб спрастаць дарогу,
Але пераконваюся, што просты шлях наперадзе.
Прысьпешваю бег і бачу, як удалечыні
Апускаецца заслона.
Не спыняюся, прымерваюся пасьпець,
І не пасьпяваю.
Усё ніжэй апускаецца герса.
Бразгаюць жалезныя створкі.
Немарасьць!
Адчуваю кволасьць свайго цела,
Але разганяюся хутчэй.
Разумею, што імчуся насустрач канцу,
Хоць не скончаны шлях.
Не спыняюся,
Бо ведаю, што іншага руху няма.
Бачу здалёк сьпёклую кроў на жалезе.
— Што рабіць? Што рабіць? Што рабіць? —
Сьвідруе адно пытаньне.

1983.

Скрыжаваньне

На скрыжаваньні
Мне заступілі дарогу трое ворагаў
І закрычалі:
— Мы заб'ем цябе, Зянон!
Тут падышоў мой сябра
І ворагі змоўклі.
Але сябра ўбачыў, што ворагаў трое, — сказаў:
— Абодвух заб'юць, —
І перайшоў на іх бок.
Тым часам падышоў другі сябра.
Але ўбачыў, што іх чацьвёра, — сказаў:
— Ты павінен мяне зразумець, —
І стаў на бок чатырох.
У гэты час напаткаў мяне трэці сябра.
Але ўбачыў, што іх пяцёра, —
Без слоў перабег да пяцёх.
Тады я сказаў сябрам:
— Глядзіце: трое іх, трое вас, я — чацьвёрты.
Хіба дазволіце ворагам забіць свайго радака?
— Не дазволім! — дружна сказалі сябры.
І ворагі адступілі.
Так мы і разышліся з таго скрыжаваньня:
Ворагі сабе, мы — сабе.
Толькі з тае пары
Я стаў вельмі асьцярожны з сябрамі
Да першага скрыжаваньня.

1983.

Нехта сьветлы

Душна.
Пэўна, душыць само паветра
Ў камеры без вокан.
Галаву абцяжарылі словы,
А плечы — работа.
Ачышчваю памяць.
Але не магу збавіцца
ад цытат,
Хоць разумею бязглуздасьць.
Імкнуся спачыць.
Але ніяк не ўсьцягну на гару
камень,
Каб іншы спусьціў яго ўніз.
Хоць бы адно вакно,
Каб зьменшала духата.
Хоць бы шчылінка,
Каб бачыць прастор!
Ноччу, калі ліпкая цемра
здратавала зрок,
А словы сьціснулі горла,
Каб нічога не выйшла з душы,
Кінуўся на сьцяну.
Думаў мур праламаць
нянавісьцю.
Але мур не заплакаў
маёй крывёй —
Злосны рогат прабег сталяваньнем.
Гэта добра.
Ісьціна — тое, што высьмейваюць дурні.
Раптам з гурту
Устаў чалавек,
як і ўсе,
Толькі з сьветлым абліччам.
Ціха-ціха, лагодна прайшоў ля мяне
праз сьцяну,
Як праз дым,
І ніколі ўжо не вярнуўся.

1985.

Воз

Па гразкай дарозе праз лес пад дажджом
Цягнуўся наш воз.
Поруч з намі ішоў стомлены чалавек
І глядзеў пад ногі.
— Падвязём яго, дзеду!
— Баюся, — пачуўся адказ. —
Ня ведаю, хто ён.
Як вораг, то можа забіць.
Стомлены чалавек ішоў
з апушчанай галавой,
І мы не бачылі
нават яго аблічча.
Хлюпала гразь пад капытамі каня,
Абадамі калёс і ботамі спадарожніка.
Падалі кроплі зь ялін.
— Вайна адвучыла людзей
рабіць дабро, —
Падумаў услых мой дзядуля. —
Сядай, чалавеча!
Той узьняў галаву
І аж вочы яго заплылі сьлязьмі,
Так ён дзякаваў дзеду.
Бо ў іншых прасіў —
аніхто не спыніўся.
І хораша стала ўсім нам траім.
Плялася спакойна гаворка,
Бадзёра цягнуўся наш воз.
Толькі потым дазналіся мы,
Што вораг сьмяртэльны
сядзеў разам з намі...
Усё сплыло, як вада, як туман,
Адзьвінела, як песьня на ніве.
Наперад цягнуўся наш воз
Цераз грэблі, балоты,
дажджы і разьлівы,
А словы дзядулі гучаць у вушах:
— Хто вораг, унучку, —
той нешчасьлівы.

1984.





Шукальнікі

— Шукаю ісьціну, — сказаў шукальнік
І пайшоў па шырокай дарозе.
Але неўзабаве ён пераканаўся,
Што ніхто не заўважае яго шуканьня.
Тады ён пайшоў тылам наперад,
Падымаючы нагамі пыл.
Усе заўважылі і даведаліся,
Што шукальнік шукае ісьціну.
Але неўзабаве ён спаткаў другога шукальніка,
Які ішоў на галаве, скакаў на барадзе,
Ехаў на языку і ляцеў на бурбалках,
Што пускаў праз нос.
— Ісьціна недасягальная, — сказаў тады першы шукальнік
І стаў думаць пра недасягальнасьць ісьціны.
Але неўзабаве ён заўважыў,
Што ніхто не ведае пра сэнс яго думаньня.
Тады думальнік сеў у кадушку,
І ўсе адразу зразумелі, што перад імі — філосаф.
Тым часам на галаву філосафа звалілася шышка.
Глянуўшы ўверх, ён заўважыў на дрэве другога філосафа,
Які вісеў уніз галавой,
Зачапіўшыся нагою за сук,
І моцна думаў.
Тады першы філосаф голасна закрычаў
Пра бескарыснасьць пустога думаньня аб недасягальнасьці,
Бо толькі дзейная творчасьць
Стварае асобу і сьвет.
З гэтымі словамі ён узяў пэндзаль
І пачаў маляваць самога сябе.
Але нікога не зацікавіла яго маляваньне.
Тады ён купіў на рынку бычка
І, прывязаўшы,
Пачаў маляваць бычыным хвастом.

Толькі зьявіліся першыя прыхільнікі новага таленту,
Калі неўзабаве ён заўважыў збоку іншага мастака,
Які залез ў страўнік каровы
І маляваў каровіным языком праз вогнетушыльнік,
Пярэднімі капытамі іграў на клавесіне,
Задняй нагой пісаў раман,
Хвастом адмахваўся ад крытыкаў
І пры гэтым пасьпяваў даіць карову
Абедзьвюма рукамі ў бяздонную бочку.
Убачыўшы гэта, шукальнік махнуў рукой,
Пайшоў да буфетчыцы Вулькі
І, выпіўшы пляшку гарбаты,
Задумаўся пра сэнс жыцьця,
Лятаючыя талеркі, Крышну-Мурці,
Індыйскіх ёгаў, Мантэня, Вульчыныя лыткі,
Заратустру, груцу з макам
І шмат пра што яшчэ,
Пакуль не стала ўсё абсалютна зразумелым.

1983.

Ноша

Ноша была такой цяжкай,
Што мне адняло рукі
І я зьнямог пасярэдзіне вуліцы.
Я нёс яе так доўга,
Што нават не памятаю,
Калі падняў на плечы.
Засталося няшмат —
Перайсьці праз дарогу,
Дзе гудуць самазвалы,
І там, пад цяністымі клёнамі,
Пад чырвоным шчытом,
Пад сталёвым мячом
Чакае мяне белагрывы дрыкгант.
Ступіць не магу. Аслабеў.
Мінаюць машыны і людзі.
Ніхто не спыняецца,
Ніхто не глядзіць у мой бок.
Падыйшоў валацуга:
„Заплаці — адняху".
Але я не меў чым плаціць.
Ды і не мог валацуга
Падняць маю ношу.
Прыкуты багацьцем, стаю.
Усё, што маё — са мной.
Поўны мяшок камяністай зямлі
З улоньня Гаўі —
Мой цяжар,

Пэўна станеш мне пухам,
Перш чым конь белагрывы
Паляціць зорным шляхам са мной.

1984 г.





Асеньні бульвар

Павуціньне павісла на жоўтым лісьце.
Гусьцее нябёсаў блакіт.
Раніцай ветах бялее,
Як лёд на вяршыні гары.
Маркотна гляджу на бульвар,
Дзе ідзе адзінокі стары.
Сівізна, быццам сьнег на каштанавых лісьцях.

Восень у Вязынцы

Восень позьняя,
Ссохла трава.
Повязь часу — туман над лясамі.
Кубак выпіты горкі да дна.
Йдзе Купала.
Лістота шуміць пад нагамі...

1981.





Жніўеньскі месяц

Жніўеньскі месяц
выплыў на небе
У тую ж ноч
І ў той жа час,
Як шмат гадоў назад.
Толькі мы не глядзім на яго
Разам,
Як некалі ў тую ноч.

1982 г.

Угодкі

(Лявону Баразьне)

У дзесятыя ўгодкі сьмерці сябра,
Як і тады,
Такія ж воблакі на небе
І сонца крывавы заход
Такі самы.

Здавалася, зьменіцца нешта
За дзесяць далёкіх гадоў.
Нішто не зьмянілася.
Толькі мы пастарэлі
І сябра няма сярод нас.

15.08.1982.

Жоўтыя воблакі

Валасы твае,
Як і ўчора,
Пахнуць летнімі зёлкамі, хной.
Толькі бачу я —
Верас цьвіце
І далёкія воблакі пажаўцелі.
Значыць, лета канчаецца.
Блізкая восень
Мяне чакае.

1981.

* * *

Я шукаў цябе, мілая,
Усё жыцьцё.
Я думаў,
Што ты спазьнілася,
І рады быў,
Што дачакаўся,
І толькі потым усьвядоміў,
Што безнадзейна спазьніўся я.

1982.





Яблынёвы сад

Мы прыйшлі ў пакінуты сад.
Бадыльлё, крапіва,
Звон пчаліны і яблынь аблокі.
Вось падмурак ад дома,
Сатлелыя рэшткі адрыны, штанкету.
Попел ветрык гарэзны разносіць —
Пах гарэлага з водарам цьвету.
Так спрачаюцца радасьць з маркотай...
Праімчаўся цягнік за зялёнай гарой.
Гром грукоча далёкі.
Купаецца ў небе галуб адзінокі...
Сузіраю цьвіценьне, красу —
Вобраз Твой сінявокі.
І журботна схіляецца гольле ў траву,
Абсыпаецца квецень на лопух...

1984.

Лошыца-78

(Уладзімеру Содалю)

Вакол запусьценьне, нядбальства
і позьняя восень.
Вось капліца, дзе некалі быў
Марцінкевіч.
Рудыя руіны, падмурак, драты.
Дагнівае павалены плот.
— Вы з Лошыцы, пэўна? —
Спытаў ты ў фуфайцы старога —
П'яны непаголены дзед.
— Нет, у нас лошади нет.
І ты замаўчаў.
Такая навокал была марната.
Запусьценьне, нядбальства
І позьняя восень.

1978.

Паляваньне

Да качкі качар апусьціўся.
Плывуць насустрач у імгле.
Цячэньне сьлед іх пазначае
І тухне месяц-каганец.

Сьвітаньне толькі задрыжэла.
Шапоча ранак свой верлібр.
Іх двое і ў нас два
Ствалы, дванаццаты калібр.

Ўзьняліся з лопатам уверх,
Разьдзёр туман сьляпучы гром,
Адбіўся рэхам у смузе,
Застаўся качар на вадзе.

Гайдаецца ў хвалях,
Глядзіць на мяне.
Па шыйцы зялёнай
Струменьчык цячэ.

І пёркі крывавіць,
І чыстую плынь.
Упала галоўка
Ў халодную стынь.

Яшчэ прыўзьняў —
Зірнуць бы на сьвет —
Панура віднееццца
Мой сілуэт.

Гляджу звар'яцела
І дых заняло.
Гайдаецца лодка,
Як птушкі крыло.

Бязмэтна плывём
Мая лодка і я,
За бортам канае
Ахвяра мая.

Гайдаецца лодка,
Плыве ў разьліў.
Быццам песьню сваю
Бессардэчна забіў.

Прыстань, мая лодка, у бераг,
Прыстань.
Пайду я ў поле адзін.

1983.



Шкадаваньне асеньняга дня

Апусьцілася сонца за лес.
Чырванеюць аблокі.
І лісьце асеньняй асіны
Ледзь чутна трымціць
Так халодна,
Нібы шоргат пяску
Пад нагамі.
Пачакай, не заходзь, не канчайся..,
Не цямней, небаспад і аблокі,
Не шапчы, верасьнёвае лісьце,
Мне йшчэ гэтак далёка ісьці.

1983.



1962 г.

Апсны*

Зыбкая цеплыня

Сьнежныя горы, халодны блакіт.
Да вяршыні рукой падаць.
Не варушыцца ружавы цьвет.



* Апсны — Краіна Душы, назва Абхазіі.



Верабейка

Верабейка шчабеча ў двары.
Няўжо прыляцеў зь Беларусі?
Цёмныя кіпарысы ў вакне.

Анакапія

Блішчыць прамень вячэрні
На камянях Анакапіі,
І ружавеюць воблакі над храмам.
Паўзе зьмяя ў схоў
Сярод руін замшэлых.
Абсыпаецца мур над бяздоньнем.

Над морам

На руінах Анакапіі
Пад воблакамі
Стары абхаз
Сумную песьню сьпявае.

Храм на гары Апсара

Шосты век Хрысьціянства?
О, гэтыя белыя пліты.
Хіба магу дакрануцца да іх?!





Пропаведзі



1988 г.
Фота Ц. Грыба

Ісьціна

У спрэчках
Ніколі не нараджаецца
Ісьціна.
Толькі нянавісьць.
Ісьціна
прыходзіць
у цішыні.

Злачынства

Аснова духоўнага жыцьця чалавецтва —
Ва ўяўленьнях аб бяссьмерці і харастве.
Няма дзеяньняў больш злачынных
За імкненьні
Пазбавіць Вечнасьці і Красы.

1986.

Пустата

Пусты чалавек
не пераносіць адзіноты.
Яму заўсёды сумна аднаму,
Бо прырода не любіць пустаты.



Размова з маленькім чалавекам

Спытаў мяне хлопчык,
гледзячы ў вочы:
— Што любіш ты, дзядзька,
Якую пару,
Восень ці лета,
вясну ці зіму?
Добра ўсё, дарагі мой хлапчынка,
Калі ў жы́цьці ёсьць сэнс,
Калі вольны народ,
Калі ў сэрцы любоў.

Бяз сэнсу пуста,
Бяз волі цяжка,
Без любові горка.

Але якая любоў бяз волі,
Якая воля бяз сэнсу,
Які сэнс без любові!

Хлюсты

1

Ёсьць людзі справы,
Што бароняць народа лёс,
Пераадольваюць неадольныя перашкоды
Ў маўчаньні і нават у адзіноце —
Спадзяюцца,
Што зьменіцца час.
Але, калі зьмяняецца час,
Прыходзяць хлюсты,
Што пішуць і славасловяць,
І пажынаюць плён.

2

Ёсьць людзі ідэі,
Што рухаюць справу,
Дзеля мэты
Ахвяруюць здароўем, жыцьцём
І едуць на полюс,
За мора, у стэп,
У ваду і агонь.
Тады ў іх дом
Прыходзіць хлюст
І жыве з жонкай.

3

Ёсьць людзі Духа,
Любімыя Богам,
Што носяць малітву ў душы.
Але прыходзяць хлюсты
І хлусяць у Імя Яго,
Каб ніхто не паверыў.

1987.

Прамоўцы

Гэй вы, плакальшчыкі
Аб лёсе ўсёй планеты!
Ужо Беларусь зьнікае.

1987.



Разваг і для сябе

Каб адчуць пяшчоту жанчыны,
Трэба бачыць
Блакітнае неба,
Зялёную траву,
Цяжучую ваду,
Жанчыну ў прыроднай красе.

Каб адчуць красу нацыі,
Паглядзі на дзяўчат
У народным убранні
На лузе жвавістым.

Каб адчуць сутнасьць духу,
Роднай мовы мелодыю слухай.

1983 г.











Кола часу

1. Час хлусьні

Ты абвясьціў гучна і горда:
Тварца няма
і пасьля нас — нічога.
Ты раскідáў сьвятыні, забіваў, хлусіў,
Пёк жалезам, гнаіў турмой,
Каб даказаць сваю веру ў нічога,
Хоць ведаў,
Што сьвет, які ты будуеш,
Не мог быць справядлівым,
Бо сам ты несправядлівы.

2. Час канца

Людзі абклаліся рэчамі.
Пачуцьці абрасьлі словамі,
Думкі цытатамі.
Гарады перапоўніліся машынамі,
Рэкі брудам,
Зямля нянавісьцю,
Душы пустэчай.
Ніхто не жыве па запаведзях.
Ці трэба палохацца,
Што ўсяму гэтаму
Прыйдзе нарэшце канец?!

3. Час кары

Уцякаем у горы,
Хоць ведаем,
што няма ў нас гор.
Задыхаемся,
бяжым у горы.
Ужо сьцямнела, а гор няма.
Нашы рукі, галовы, целы — у сажы.
Сажа ў нашых лёгкіх,
на нашых зубах.
Сажа на Зямлі і на Небе.

Грыміць.
Сыплецца чорны лёд.
Чорныя маланкі не асьвятляюць Зямлю.
Мы ляцім з хуткасьцю ледзянога ветру
У чорным маўчаньні
І не ўсьведамляем,
Што нас няма,
Толькі душы нашы
Апантана бягуць
Па халоднай Зямлі.

4. Антычас

Жоўтае сонца ў зеніце.
Побач месяц і зоры.
Чорныя воблакі крыг
Бясконца плывуць
па бяскрайняй вадзе,
І бяздоннае сіняе неба
адбіваецца ў ёй.
Цішыня. Толькі плюсканьне хваль
І шоргат счарнелых ільдоў
Зьліваюцца ў шэпт
над Сусьветам.

1984.





Багаслаўленьне. Фотаграма



Горад. Фотаграма



Вершнік. Фотаграма

Зямля без людзей. Фотаграма



* * *

Журбой асьвятляецца дух.

Тыя

Тыя, што прымушаюць народ
Слухаць хлусьню, —
Вучаць яго
хлусіць.

1987.

Кроў чалавецтва

Ні адна ідэя
Не можа быць справядлівай,
Што ўсталявана
Праз праліцьцё крыві.

Закон: усё міне.
Але праз цемры часу
Кроў забітых прасочыцца
І змые бруд ідэй.

Застанецца адна,
Абмытая
Нявіннаю
Крывёй.

1982.





Адлюстраванне

Зімовы дзень

Колкі мароз бадзёрыць дыханьне і дух.
Урачыста маўчыць лес хваёвы.
Сьнег з ружовых аблокаў
Сухі, нібы пух тапалёвы,
Па іголках сасны шапаціць.
Чысьціня на Зямлі і Нябёсах.
Вавёрка зьбягае ўніз па ствале
І, як быццам не бачыць мяне,
Замятае сьляды ў сумётах.

Квітнеючы сад
у вясновую ноч

Месяц сьвеціць вясновы
празрысты.
Ярка льецца сьвятло на ральлю.
Адцьвітае зялёная вішня.
Толькі ветрык дыхнуў, —
Быццам сьнег сакавіцкі,
Бязгучна пасыпаўся цьвет.

Сьвітаньне

Сьвітае раніца пасьля дажджу.
Абмыты пясок на дарозе.
Празрыстыя лужы.
Заліты мурог.
Сьвяты час.
Белы конь.
Затаіўся ў лісьцях сон.

Цяпло

Летні поўдзень, сасоньнік, сьпякота.
Вецер дыхае пахам смалы.
Прашумеў дождж касы, пералётны.
Прамяністыя кроплі на лісьцях малін.
Басавіта гудуць чмялі.

Мэлёдыя

Слухаю спевы людзей,
Што ўжо не жывуць,
Запісаныя на кружэлках.
І музыка гучыць
Напоўненая болем.

Старое мястэчка

Высахла рэчка,
зьнік бор і лугі,
Паўміралі дзяды.
Так хутка ўсё зьмянілася,
Нібы трапіў у іншы сьвет.
Што тут за людзі?
Адкуль узяліся?
І што яны робяць
у гэтым жыцьці:
Кожны — сабе?

1987.



Ледавік

Латаці цьвітуць на зыходзе вясны.
Кудра.
Мокры пясок Гаўі.
Берагі.
Пах.
Сьляды.
Бясконца плывуць сьнягі.





Раніца ў кастрычніку

Сьвечкай з коміна дым над страхой.
Серабрыстая шэрань
на бэзавым лісьці.
Пабялелая рунь на палях.
Чую ёкат сабак —
Як страла, заяц шэры
ратуецца ў лес.

Пішу ў красавіку, калі зышоў сьнег

Паніклае гольле плакучай вярбы
Павісла над краем цякучай вады.
Стракоча сарока
далёка.
У калючых кустах
Чарнее яе гняздо.





Рэзкі вецер у жніўні

На раніцы вецер халодны.
Азёрныя хвалі бягуць
на драўляны памост.
Віснуць хмары над шэрай вадой.
Адляцела за бераг блакітнае лета.
Жаласна чайкі крычаць
Над самотнаю лодкай маёй.





Татарскі магільнік

Зялёным імхом парасьлі камяні, надмагільлі.
Арабская вязь. Густая крушына.
Мястра блішчыць за гарой.
Рудая трава.
Сьлізгаюць ногі на схіле...
Хто прачытае
Пра тых, што памерлі?
Стос папер на дубовым стале.
Мустафовіч Іван — апаратчык
Няўцямна глядзіць на мяне.

1985.

Дрывяты

Навальніца грымотная
над Дрывятамі.
Аблажыла кругом. Вечарэе.
З цёмнага неба сьцяною лье дождж.
Быццам кіпіць за бортам вада.
Плёскат вёслаў не чутны
у ліўневай мгле.
Ледзь прыкметна мігцяцца агні
На сьцямнелых гарах.
Набліжаецца Браслаў стары.
Мокрая прыстань плыве на мяне.
Сьвеціцца лямпа ў далёкім вакне.



Лодка

Цёплым вечарам у жніўні,
Калі запаліліся зоркі
Над вечнай нашай зямлёй,
Сядзе пасадзіў у лодку сваю сям'ю
І дзеля прыемнасці
жонцы і дзецям
Паплыў на вёслах
У далёкі азёрны змрок.
Я зь берага бачыў:
Ледзь чутна гайдалася лодка
І ціха плыла ў туман.

1982 г.



Мікасецк

Прыцемак цягне
з зарослай ракі
Атуляе кустоўе каліны,
Пахілыя вербы і хмель.
Сыра пахне цьмянец,
асака.
"Кароўка мая", — чую голас
жанчыны.
Бразгоча дайніца,
Шэрая птушка бязгучна
мільгае ў лазе.

1982.

Жнівень у Мікасецку

Захад барвяны за Чорнай гарой,
Туманы.
Чакаю пагоднага дня.
Ярка зоры блішчаць.
Ужо прыпах асеньні.
Брэх далёка чуваць.
Рана сонца ўзышло —
Дыяменты расы на шыпшыне.

1982.

Пад елкамі хаваюся ад дажджу

Пад парасонам елак
смольна пахне шыльнік.
Сеецца дождж угары.
Сцякае ўніз па ствалах вада.
Стаіўся мураш пад лістом.
Не адводжу вачэй ад сцябла
крапівы.
Непрытульныя думкі снуюць.

Час асіны

Брусьніцы на хвойных палянах —
Пунцовыя кроплі на сініх імхах.
Рэдкая зелень бяроз
ахінае белыя ногі дрэў.
Верас цьвіце.
Азываецца конік у ссохлай траве.
Адзінока зьвініць аса.
Сьвеціцца воскам паўдзённым прамень
на смалістых ствалах —
Падманліва лета міргае —
былая краса.
Ды дарма.
Кармінам ірдзее асіна здаля.
Прыходзіць яе пара.



Разьліў

Разьлілася Гаўя зь берагоў
Ад дажджоў,
І палошчуцца хвалі па летніх лугах,
Гайдаюць рамонкі, званочкі, лазу...
Зьмянілася толькі рака,
А здаецца, што ўвесь белы сьвет.
Перапоўніла плынь цеснату,
Перакрочыла сьмерць.
Не вяртайся назад, памарудзь.
Не сьпяшайся дамоў паміж дрэў,
Я яшчэ не ўбачыў чагось,
Я яшчэ не ўсё зразумеў.



Ружовы сон

Ноччу, калі гучна цікаў гадзіньнік
І пахла зёлкамі ў пакоі,
Адчуўся водар ружы.
Нейкі добры дух наведаў мяне ў цемнаце.
Уключаю сьвятло —
Толькі стрэлкі бягуць
І пахне зёлкамі ў пакоі.

Пасля навальніцы іду паміж дрэў

Адплыла ў палі
цёмна-сіняя хмара.
Бурштыновае сонца
гуляе ў лістах.
Сьцішыўся ласкавы лес.
Хвоя набракла дажджом.
Стракочуць сарокі
ў мокрых ствалах.
Падаюць кроплі на мох.
Крокі мае шапацяць.

Раніца на Пцічы

Рабаценьне на люстры вады.
Гэта ветрык забег у чарот,
Устрывожыў стракоз.
На гарлачыку белым
Кроплі сьвежай расы,
Цень ад крушыны;
Бурая раска
Плыве між сьцяблоў асакі,
Горка пахне аер.
Звон далёкай касы.
Чую клёкат бусьліны.
Падымаецца сонца з зялёнай даліны.

Стаў

Лісьце вярбы шэпча ветрам асеньнім,
Ападае дажджом на паверхню вады
І сплывае да застaвак мокрых,
Абліпае рудыя карэньні.
Сьвішча белы струмень
З-пад імшэлых бярвеньняў,
З шумам бяжыць па каменьнях.
Месяца бледны прамень
Рабаценьне халоднай ракі асьвятляе.
Духам таемным цямнеецца млын —
Даўняя казка — успамін аб былым.

Ціхі вечар у сьнежні

Глыбокі спакой на сьвеце.
Апускаецца змрок
І падае сьнег на стрэхі,
Тае на вейках,
Сьцякае сьлязой.
Вечарэе.
Хаваецца лес у пуховы сувой.

Сакавік

Сьнег набрыняў вадой,
Пажаўцела ігліца на хвоях старых.
Але змрок выпаўзае з-пад цёмных ялін
І начуе зіма ў бары.
Толькі вецер вясновы шуміць угары,
Белыя шапкі скідае з сівых верхавін.

Позьні жнівень

У садзе астры ўжо зацьвілі.
Рэдкае гольле бяроз
гойдае вецер сухі.
Смуга на палёх.
Конікаў стрэкат паўдзённы
Зьліваецца з шумам пажоўклай травы.





На Іслачы думаю пра інсургентаў

Пасохлы чарот.
Ветру сьвіст.
Коней лёт.
Засыпаны сьнегам лёд.
Сьляды.

Бабіна лета

Чую сьмех малады,
Шолах шоўку —
Лета бабіна йдзе.
Пунсавее кармін на зары.
Бісер кропляў —
Раса ў павуціньні.

Позірк зь Вялейкі

З высокай Вялейкі далёка відаць.
За ракой рыжы восеньскі поплаў,
Сіні хвоевы лес,
Гарадзішча — успамін аб народзе.
Жоўты колер сьвятла,
Жоўты ліст,
Шпіль касьцёла,
Серабрыстая ніць.
Жоўта хмарка на жоўтым
заходзе.
Ткуцца думкі ў сьцішаны строй —
Успамін аб забытым народзе.

1982.

Вязынка

Цьмяна ў хвалях зялёнай вады
Адбіваюцца вербы старыя.
Ужо змрок атуляе ўзгоркі і лес.
Бязьлюдна кругом, адзінока.
Не сьвецяць агні на паркан.
Не бялее валун наўзбоч.
Праз цёмныя шыбы глядзіць сьлепавока
Самотная хата ў ноч.

* * *

Бабіна лета сьцелецца мройна
ў жоўтым сьвятле.
Ападае рабіна і клён.
Млява звон зазьвінеў
на далёкай царкве.
Там ля купіны дрэў
жалобнае шэсьце ідзе.

1981.

На сярэдзіне Пцічы

Глыбокая плынь Пцічы
Пад вузкім чаўном.
Плывучыя астравы
І бяз краю высокі чарот.
Лабірынты пратокаў,
Асака і аер, быццам лес,
У зялёнай вадзе.
Вось вяршкі рэдкаліснай крушыны,
Расступіўся духмяны цьмянец —
На ўзгорыстай высьпе
Саламяныя стрэхі плывуць.

1981.

Букет

Чэрвеньскі вечар
цямнее ў шыбах.
Ты пайшла.
Застаўся твой букет
І ў цішыні
Твая нябачная
прысутнасьць.

1982.

У гасьцях
у Ларысы Геніюш.
1978 год

Успамінаю голас Ваш:
"А гэта Янка
З трэцяга ОЛП'э".*
"Ды не — з другога", —
І сарамліва ўсьміхнуўся.

* ОЛП — Особый лагерь политических.

Перад сьвітаньнем

Не віднее яшчэ.
У цемнаце
Шумяць чараты.
Там нябачная плынь
Пцічы.
Усплёск вясла.
Галасы.
Дзесь далёка крычаць
Сычы.

Балота

Імшарныя, зялёныя,
З багульнікам і буякамі,
Дзе журавіны й журавы,
Як позіркам абняць,
Усё балаты і балаты.
Тут цэлы сьвет,
Свая прастора,
Нібы блуканьне ў тумане.
Тут псіхалогія
Таемнага нязнаньня.
Але разьвеяўся туман,
Асушана балота.
Раўнюсенькі, як стол, прасьцяг.
Ды толькі парадокс —
Змалеў, спрастаўся, звузіўся прастор.
Якая перамена!
Трывожна нават на душы.
Пустое неба над палямі.
Лятуць у вырай журавы.

1987.

Лясьнік

(А. Разанаву)

Як хораша сказана ў вершы
Пра шэрань у сьнежных лясах.
Чуеш, як стукае палкай лясьнік?
Прабуе драўніны моц.

1987.



Цьвіценьне

Дзіўлюся. У лесе старым,
Паміж елак і хвой,
У чашчобе глухой,
На пахілай градзе,
Адзінокая вішня цьвіце.



Алышаны

Цячэ Гарынь у берагах,
Настоеная на траве,
Паўз лодкі і частакол.
Паміж дрэў пустата —
Згарэла царква.
Немата.

1986.

Цёплы дождж у ліпені

Дождж пад кронамі белых асін
Шуміць, як рака.
Пах травы.
Кучаравыя вербы ў пойме Гаўі.

На Грунвальд!

У бел-чырвона-белым квеце
Куды імкнуцца пад сцягамі
Харугвы конныя, баяры
І рыцары стальныя?
— На Грунвальд, пане.
Устаўшы рана, йшчэ да дня,
Куды сыпяшае латнік пешы,
Што йдзе праз замак Гарадзенскі?
— На Грунвальд, пане.
Із-пад Воршы і Смаленска,
Із-пад Віцебска і Менска,
Із-пад Вільні і Мсьціслава,
З Магілёва, Ізяслава,
Нібы хмара, нібы лава,
Мкне Пагоня — наша слава,
Мкне, як бура над палямі.
А куды?
— На Грунвальд з намі.
Гэй, на Грунвальд
усе, хто вольны!
Гэй, на бітву
ўсе, хто сьмелы!
Гэй, наперад,
хто жывы!
Можа, сёньня — мо ніколі,
Можа, усё, а мо нічога.
Альбо пан,
альбо прапаў!
"Па беларускім бітым шляху
Йдуць беларускія сыны..."
На Грунвальд, хлопцы,
Гэй, на Грунвальд!
Зламаем сілу Сатаны!

Лунай, лунай над намі, песьня.
О, Багародзіца, пануй!
Наш кожны першы ўваскрэсьне,
О Беларусь, о Беларусь!..

25.08.1988.



Багаславеньне рыцару

Багаславёны клён
Пад ліпеньскім дажджом
Непранікнёны —
Прытулак жабраку.
Багаславёны рыцар на шляху.
І конь яго
Залатагрывы, агнявы,
Багаславёны.
І Вільня
Тройчы будзь мая багаславёна.
Скачы, ваяр!
Гані за здрадай!
Імчы, ваяр, пад сьпеў Пагоні!
І прынясі свабоду.

24.08.1988.

1990 г.
Фота У. Кармілкіна

1989 год

Ніхто не займаецца
сваёй справай.
Усе паглыбіліся ў палітыку.
Песьні сьпяваў бы
на схіле гадоў.
Але змоўкні, душа,
не іграй.
Прывід прускага барда
стаіць увачу
І жменя
пустых
арэхаў.



Дзяды

Прырода поўная маіх пачуццяў.
Толькі нікому няма справы
да маёй прыроды.
Спакойна ж і я
параскідваю ваша
жалезьзе.
Але, калі я прыйшоў, каб раскідаць,
То ўбачыў пад попелам душ
Магілы маіх дзядоў.

11.12.1988.



Дзень нараджэньня

Памятаю: у дзяцінстве,
калі мама была маладой,
Неяк сказала мне ўранку:
— Сынок, сёньня ты нарадзіўся.
Дзякуй, мілая, дзякуй,
Што я жыву на гэтым сьвеце,
Дзе поўна жалю і красы.

24.04.1988.

Настальгія

З Масквы ў Менск
Цягнік грукоча.
Я малады, мне 18.
Ах, кепска мне,
Ах, блага!
Ні спаць, ні ўстаць,
Ні піць, ні есьці,
Ні думаць, ні гадаць.
Нядобра жыць,
І сэрца ные:
Хутчэй-хутчэй
Пад стук калёсны...
Хаджу адзін
З канца ў канец
І ў шыбы не гляджу
І толькі прад Смаленскам —
О, Беларусь!
Я да вакна прынік.
Пагоркі пазнаю.
І незнаёмы краявід
Такі знаёмы...
Вось хаткі,
Гумны ў купцы дрэў.
Вакол авёс нязжаты.
І быццам дыхае адтуль
Хваёвым пахам.
І ціхі змрок,
Як у сьвяточны дзень,
Спускаецца над краем...
І стала раптам чыста так
І хораша, спакойна.
І сон змарыў
Так незаўважна
У мільгаценьні соснаў...
Праспаў Смаленск
Пад стук калёсны.

1981.

Лаза

Вясной пассякалі лазу ля ракі
І кінулі ўбок ссыхаць.
Настала цяпло —
І яна зацьвіла,
Сабраўшы апошнія сілы.

У дзяцінстве трапляю ў вір

Сонечны зайчык гуляе ў вадзе.
Пясочак бяжыць. Камушкі —
Бачу ў першы-апошні раз.
Ужо паветра няма.
Коле ў грудзі —
Зьвініць вадзяная трава.
Я такі йшчэ малы.
Мне б пажыць.
Але думка адна:
Скора лягу на дне —
Бедна мамка мая.

У гасьцініцы

Унізе аркестр грукоча.
Шалёныя танцы, смуродлівы дым.
Цішыня ў пакоі маім.
Настольная лямпа.
Маўчыць тэлефон.



Рэха

Усё жыцьцё гаворыш,
Але цябе не чуюць.
Усё жыцьцё стукаешся,
Але адчыняюцца пустыя дамы
Без вакон, без ікон, без сьвятла.
Шукаю сяброў сярод радакоў,
Але сэрца спакою ля дрэў.
Не ўцячэш ні ў кляштар,
ні ў пушчу, ні ў скіт.
Лесьвіца ў пустаце.
Адыходжу ў сваё аблічча.
Але не знаходжу нават яго.
Так часта блукаю ў тумане
надзей,
Што не заўважаю,
Як вецер адносіць імя ў акіян,
Толькі рэха маё застаецца
са мной.
Толькі рэха маё
пакідае мяне.

1985.

Яблык

Я паклаў яблык на край вакна
І адчуў,
Што ён поўны таемнага зьместу.
Тады я пераклаў яго на талерку
І ўбачыў плод,
поўны хараства...
Мо' таму, што нагадвае нечым Зямлю
І спараджае ўспаміны пра Еву.

Ля-мажор

(Р. Барадуліну)

Не ў шматслоўі праўда.
Ісьціна — у харастве.
"Лілею млявы плёс люляе", —
Ты напісаў,
Адкрыўшы тайную прыроду слоў
У першароднай іх красе.

1981.

Сінія астры

На раніцы ў цішы пакоя,
Калі ўзыходзіла сонца за вокнамі,
Памятаю, паставілі мне на стол
дзеля радасьці
Чорную вазу з сінімі астрамі,
чакаючы пахвалы*.
Ужо зьнікла начная раса ў букеце.
Маркотна маўчу,
думаючы пра незваротнасьць.

1985.

---

* Сіняе з чорным — камбінацыя колераў меланхоліі і маркоты.

Аднойчы вясной

У паветры вясна.
Цьвіце бэз і рабіна.
Чую тупат глухі —
Крочыць рота салдат,
Крочыць шчыльна ў рад,
І ніхто не глядзіць у бакі.

1984.

Шкадую аб вясьне

Трэба жтакі? Захварэць,
Калі вішні цьвітуць.
Вярнуўся ў сад —
Сьнегапад.
Адцьвілі без мяне.

Хмара

Над верхавінамі сініх елак
У сьпякотным белым небе
Цішыня.
Не варушыцца ліст на дрэве.
Спынілася рака,
Замоўклі авадні і мухі,
Так ярка сонца сьвеціць,
Што выцьвіла трава
І горача вачам пад вейкамі,
І перасохла ў роце,
І занямеў язык —
Так сонца, як сто тысяч сонцаў,
Сьвеціць.
І апускаецца мураш
З гарачага сьцябла
У свой мурашнік...
Шалёная хмара,
Чорная, нібы ноч,
На сьпякотным белым небе
Ляціць
Над верхавінамі закамянелых елак
У мёртвай цішыні...

27.11.1983.

Хлопчык уначы

Дарога ў бераг —
Страла ад пакут —
Чорны вір,
Тупат ног.
Яшчэ адна сьмерць,
Яшчэ адзін стрэл
Перайшлі за парог.
Відзеньне тваё
За табой —
Голас мой —
Шлейф жыцьця —
Гэта я —
Хлопчык у цемнаце.
Не пакінь мяне аднаго,
мама.

17.01.1987.

Ліст белай паперы

Вось белы ліст перада мной.
Каб можна так было
Сьпісаць жыцьцё спачатку,
Як белы ліст перада мной.

Пара лічыць грахі, памылкі,
Уздыхаць аб радасьці, бядзе,
Хоць быў цяпершчыны сувой,
Як белы ліст перада мной.

Не марна згінула усё,
Што адпалала-адплыло агнём-вадою,
Калі заўжды жыцьцё маё,
Як белы ліст перада мною.

1983.

Пішу як бывае

Далей цярпець немагчыма.
Хапаюся за вастрыё,
Што клінам уперлася ў кут.
Але чуецца сьмех за вокнамі.
Некаму сьмешна ў гэты час.
Сьцяўшы зубы, роспачна азіраюся,
Гатовы на нешта.
Белае воблака, як гара,
Вісіць над вершалінамі хвояў.
Дзьве ластаўкі, быццам рыбы,
Купаюцца ў небе.
Раптам усьведамляю,
Што так было да мяне
І будзе заўсёды.
Які недарэчны мой гнеў,
Калі трэба радавацца і цярпець.

1985.



Гучаньне анёльскага голасу
(*песьнявы варыянт*)

У цішы над Зямлёй, у эфіры начным
Голас чысты гучыць — так пяе херувім:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... *2 разы*

На радзіме маёй ён, як сонца прамень,
Белы цьвет веснавы і крыніцы струмень:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... *1 раз*

Беражы, сьцеражы нас у чорнай бядзе.
Я далёка, далёка ў лясной старане:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... *2 разы*

Там, дзе сосны шумяць, там, дзе хмары бягуць,
Хай гучыць над Зямлёй, над краінай маёй:
— Авэ, Марыя, грацыя плена... *1 раз*

— Авэ, Марыя, грацыя плена,
Coda:
Авэ, Марыя...

Мсьціслаў

Здаецца, што не дождж —
Сцякае кроў з узгоркаў
Уніз па баразьне
Праз тры стагодзьдзі
І пакідае сьлед.

1987.

Лебедзева

Коціцца плыткая стужка ракі.
Мігціцца ў сонечных бліках струмень.
Каменьні на дне, жоўты жвір
Празрыстасьць крынічнай вады выяўляюць.
Мые босыя ногі дзяўчына.
Сьляды на пяску.
Зашумела ліпа ў верхавіне.
Азірнуўся —
Лебедзь белы бязгучна плыве —
Адбіваецца воблака ў плыні.

1984.

Павевы

Хаваецца сонца ў дубах,
Промні згасаюць на шэрай кары,
Дыядэмай зацьвіў асот,
Паміж купін блішчыць вада.
Цішыня.
Белы конь прамільгнуў
паміж дрэў,
Як страла.
Змаўкае мелодыя дня,
Адляцела яго душа.



Шэрая восень

Ужо зжаты авёс,
Апусьцела іржышча,
Дождж асеньні разносіць вятрыска,
Быццам іскры агню з папялішча.
Прэла пахне саломай
І мокрай зямлёй,
Каляіны набраклі вадой.
Пастух адзінокі паныла
Брыдзе за сваёй чарадой.

Старая паштоўка

Праз паціну часу
З таго стагодзьдзя
Глядзіць з парыжэлай паштоўкі душа,
Поўная хараства,
У юным абліччы дзяўчыны.
Усьведамляю —
Ужо няма на Зямлі гэтых воч
І цела зышло ў нябыт;
Састарэла,
Пажоўкла папера,
Раскладаецца чорны брамід,
Блішчыць серабро сівізной,
зьнікаюць адценьні,
А душа ўсё глядзіць на людзей
з тых часоў —
Цэлы сьвет паўстае
ў імгненьні.

Раскладаю цяпельца

У час дажджу
У лесе прамоклым
Я агонь разлажыў —
Сонна гарыць
І кідаецца ўбок белы дым.
Кроплі шыпяць.
Закрываю цяпло крысом,
Целам сваім ад вады.
Уся прапахла адзежа мая,
Нібы трут.
Разьдзімаю бярозту,
Шчырую над кволым вуглём.
Коцяцца сьлёзы з вачэй.
Ты гары, мой агонь,
У халодным бары.
Ты гары, мой агонь,
Пасярод дажджу.

1984.

Візіт генерала

Калі сонца заходзіць над Беларусьсю,
У чорных акулярах па трапу
Спускаецца генерал
У скупыя абдымкі няверных сяброў.
Я памятаю вас,
Калі маці маёй цяжарнай
Настаўлялі ў жывот аўтамат.
І шаптала малітву Яна да Бога,
Каб я быў і памятаў вас, бандыты.
Якая мне справа да вашых праблем,
Калі сонца заходзіць
над Беларусьсю.

1985.

Мроя
над клёнавым лісьцем

З-пад сходаў гранітных
вырас клён.
Смокча счэсаны камень.
На руінах касьцельных
У вэлюме белым
Маладая дзяўчына стаіць
І плача.
І плача ў асеньнім тумане.

1986.

Расстаньне з каханай

Разам з сьнегам густым
Змрок на сьвет апусьціўся.
У вэлюме белым дрэвы і дрот.
Калі ноччу вяртаўся,
Бачыў побач з сваімі на сьцежцы
Маленькі твой сьлед.
Крок за крокам ішоў я
насустрач былому,
Але, як прыйшоў,
Цябе не было ў цішыні...

Адзінокі прахожы

Як добра, калі дождж
Па летніх вішнях шапоціць
І гром грукоча над палямі.
Куды сьпяшаеш ты
пад парасонам,
Такі задуманы ў сабе?

1987.

Гляджу на дрэва

Калісьці я жолуд
садзіў над вадой.
А сёньня пад дубам —
гляджу —
Маладая дзяўчына
ў вянку
Задуменна над плыньню
стаіць.
І воблакі ўдаль
адплываюць.

1987.

Асеньняе неба

Скончыўся дождж асеньні.
Туман над далінай.
І першыя зоркі ў небе халодным,
І побач няма цябе...
І што гэта вечар такі маркотны?

Вячэрні цягнік

У адчыненае вакно вагона
з палёў
Праз колавы стук
Даносіцца конікаў сьпеў.
О таемныя, дзіўныя гукі
Пад зорамі ў жніўную ноч!

Фатаграфія ў стылі мадэрн

Ты адыходзіш
ўдалячынь,
Таемная паненка.
Твой сілуэт
Між прыдарожных дрэў
зьнікае.
І ветру шум,
і ветру шум
У полі.



Страла

Сілы няма
расьцягнуць тугі лук.
Рукі нямеюць,
цямнее ў вачах.
Толькі б пусьціць мне стралу,
Толькі б пусьціць мне стралу,
Пакуль я жыву.
Ты ляці ў бяздоньне,
страла.
Зазьвіні ты, мая цеціва.

1983.







Харaство Боскае і краса дэманічная
(*З цыкла "Дзьве красы"*)

Адна краса яркая, кідкая, гучная, гордая, самаўпэўненая, гарачая, халодная, жорсткая, пачуцьцёвая, вытанчаная, грубая, цялесная, эратычная, гістэрычная, манерная, злая, разгульная, разбуральная, эгаістычная, страсная, кахае і ненавідзіць. Яна рагоча. Яна дзейнічае, як моцнае віно, на слабую галаву, як опіум, на душу.

Другая — ціхая, журботная, сьветлая, спагадная, душэўная, сьціплая, непрыкметная, тонкая, глыбокая, велічная, добрая, ласкавая, узвышаная, стваральная, чыстая, спачувае і любіць. Яна плача. Яна, нібы рака, што ўплывае ў акіян Вечнасьці, а ты падарожнік, спачыў на яе берагах альбо ступаеш у човен, гатовы плысьці па хвалях у нязгаданы сонечны сьвет.

1985.

Знакі
(З цыкла "Дзьве красы")

З кожнай вокладкі
Рагоча рот.
З кожнага абраза
Глядзяць вялікія
сумныя вочы.

Перараджэньне
(З цыкла "Дзьве красы")

Пачатак

Жывапіс: угінаецца стол ад яды.
У Багародзіцы какетлівая ўсьмешка.

Працяг

Музыка: гістэрычна крычыць маг.
Вальпургіева ноч пад гітары.

Харaство і боль
(З цыкла "Дзьве красы")

Без прыгожага няма Ісьціны.
Без красы — справядлівасьці.
Харaство — у харaстве.
Боль яго ачышчае.
Таму такая журботная
сапраўдная краса,
Таму такое чыстае
Боскае харaство.

Эстэтыка дабра і зла

Прырода, як і чалавек, створаная Богам на груньце свабоды і дабра. Але прырода не мае свабоднай волі, таму ў прыродзе няма зла.

Мастацтва, якое апісвае і адлюстроўвае замілаваньне прыродай, — добрае.

Калі ж аб'ектам і зьместам мастацтва становіцца чалавек, яно не можа не выяўляць падвойную прыроду чалавека, які ўтрымлівае ў сабе і дабро, і зло. Тады эстэтыка падзяляецца, утвараюцца якасныя ацэнкі мастацкага ідэалу і хараства як зьявы Боскай і дэманічнай, як мастацтва замілаваньня і мастацтва страсьцяў. Але найчасьцей краса ў такім мастацтве ўжо не існуе ў асобным падзеленым выглядзе. Дабро і зло перамешаныя. Краса робіцца канвергентнай зьявай. І гэта найгорш, бо тады зло паразітуе на дабры і засвойваецца праз яго.



* * *

Як думаем — так і жывём.
Якія думкі — такое і жыццё.
Усё пачынаецца з ідэі.

"Стралою думка мільганула..."

Прасталінейнае мысьленьне
Стварае прымітыўную прыроду —
Выпростваньне рэк.

* * *

Закон жыцьця, дадзены Богам дрэву, шмат больш высакародны, чым свабодная воля разбэшчанага чалавека.

Паганцы

Паганцы моцна прывязаныя да пачуццёвага сьвету. У іх няма ахвяраў дзеля духу. Адпаведна не існуе і духоўнага жыцьця. Паганства — гэта паўжывёльнае існаваньне.

Ніхто не ахвяруе сабой ці хоць бы сваімі звычкамі дзеля духоўнага жыцьця.

* * *

Чалавека вылучае ў прыродзе тое, што ён мае ўсьвядомленую гістарычную памяць роду. Гэта забясьпечвае культурнае разьвіцьцё.

1984.

* * *

У чым сіла старажытнага Кітая? У высокай культуры. Перад ёй аказаліся бясьсільнымі вандроўныя заваёўнікі.

* * *

Рухнула імперыя. На руінах блукаюць імперыялісты. І не могуць зразумець, як гэта ўсё развалілася.

* * *

Накірунак хрысьціянскага мастацтва — будучыня. Бязбожніцтва — без накірунку, геданістычная сучаснасьць.





* * *

Харaство (краса) ня ёсьць адзіная цэльная катэгорыя. Яна мае якасныя крытэрыі. Краса бывае Боскай і дэманічнай.

Боскае харaство ўспрымаецца праз замілаваньне зьявамі, формамі, целамі прыроды. Дэманічнае — праз пачуцьцёвую страсьць.

Чалавек, далёкі ад мастацтва, успрымае рэчы ў функцыянальным выглядзе.

Замілаваньне рэчамі — гэта ўспрыняцьце іх у прыроднай (Боскай) сутнасьці, адчуваньне Боскага стварэньня.

Дзеячы еўрапейскага Рэнесансу пачалі метадычнае раздваеньне харaства, парушаючы перш за ўсё адэкватнасьць паміж яго ўнутранай сутнасьцю і зьнешнім выяўленьнем.

Еўрапейскае мастацтва пачынаючы з XVIII ст. схіляецца да культу дэманічнай красы.

1985.

* * *

Хваля ёсьць формула і форма хараства.

Крэда

Вершы: Мала слоў. Рытм. Канкрэтнасьць думкі і пачуцьця, выяўленая праз падтэкст. Праз падтэкст пранікаем у сутнасьць рэчаў.

1986.

* * *



Вершы самі па сабе, зрэшты, як і ўвогуле творы мастацтва, мала значаць, а часам і нічога. Значэньне іх адкрываецца ў працэсе ўспрыняцьця. Гэтак жа як тэатр, што жыве ў сувязі "сцэна—глядач", адкрываецца ў сумоўі. (У адрозьненьне ад музэйнага ўспрыняцьця, дзе музэй і глядач існуюць асобна, самі па сабе.) Клясычнае мастацтва, як і ўвогуле акадэмічнае мастацтва, само па сабе — музэй. Патрэбна плынь часу, каб узьнікла яго ўспрыняцьце.

1981.

Карціна сьвету

Самыя вялікія мастацтвы —
Музыка Боская
І фатаграфія чалавечая.
Музыка — вечнасьць.
У фатаграфіі — адбітак яе —
Дачасная плыннасьць быцьця.

1986.



Зьмест

СЛОВА АЎТАРА 1
УСТУПНАЕ СЛОВА 6

ЛІСТЫ ДА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ
«О, зямелька мая...» 10
Сьвятло ў душы 12
Папяловы смак 12
Вечны сад 12
На Браслаўскім замчышчы сустракаю ўсход 13
Журботная радасьць спатканьня 14
Гара, парослая шыпшынай 16
«Ранак вясеньні, вішняў цьвіценьне...» 17
Дзень жалобы 19
Вербны ранак 22
Зьвеставаньне 22
Вобраз роднай зямлі 25
Доля 25
Ворагі 25
Дарога 26
«Калі на сэрцы роспачна і кепска...» 26
«Мілая мая...» 27
Вяртаюся на Беларусь 28
Ля Налібоцкай пушчы 28
Шыльнік 32
Успамінаю сябра 43
«Са мной заўсёды вобраз твой...» 49
Цьвіценьне хвояў 49

СЬВЕТЛЫЯ РАДАСЬЦІ
Хвоя, асьветленая сонцам 52
На Прыпяці 52
Высокі бераг над Гаўёй 52
Як добра 53
«Калі цьвілі адуванчыкі...» 53
Ціхі дожджык 53
Пялёсткі 54
Летуценьні 54
Пішу на прыстані 54
«Калі мы ішлі...» 56
«Нічога не ведаючы пра будучы лёс...» 56
Сустрэча 56
Бутон пялёсткаў для Евы 57
Музыка юнацтва 62
Музыка 63

ВАНДРОЎКІ
Адпачываю ў вандроўцы 65
Іду пешкі 66
Краявід 66
Іду між палёў 66
Купкі дрэў 67
На беразе 67

Стамленьне 67
Габрусь 68
Цёмны хутар наводшыбе 69
Сталоўка ў Ракаве насупраць царквы 69
Восень у Гальшанскім замку, дзе зрабілі хлеў для жывёлы 72
Ідзем з сябрам па старым вялейскім шляху 72
Ячменнае поле 73

ЧУЖЫЯ ГАРАДЫ

Шэрая ноч 76
Пішу ў садзе чужога горада 76
Лёндан 76
Разьвітаньне з чужым горадам 77
«У халодным горадзе чужым» 78

МОЙ ДОМ

Карціна маёвага ранку 82
Знаёмыя краявіды 82
Стаю на вераньдзе 83
Май 83
Цёплы дожджык 84
Час, калі цьвіце лістоўніца 85
Чырвоная гара 85
Еду на ровары з Суботнікаў у Васілевічы 85
Лістоўніца 86
«Ноччу маланка пакой асьвятліла...» 86
Куст язьміну 86
Цішыня 87
Час, калі заходзіць сонца 87
Цёмным асеньнім днём не выходжу з дому 88
Слодыч маўчаньня 88
Верасьнёвая ноч 90
Вечарам стаю на парозе 90
Сьмерць удома 91
Угодкі ў верасьні 91
Шэлест асеньняга ветру 92
Студня 92
Чытаю вершы пад шум дажджу 93
Восень удома 94
Асеньнім вечарам вяртаюся з вандроўкі 94
Іду здалёк 95
Ноччу ў цішыні 95
Вечары 95
Каляды майго маленства 96
Вячэрні час 97
Летняя раніца 97
Вечарам іду дадому 99
Маці 99
Вечарам іду праз лес з Замаслава ў Суботнікі 100
Вечарам іду 100
Вечарам вяртаюся дадому 101
Ратуюся ад навальніцы 102
На дарозе да станцыі разьвітваюся з матуляй 103
Дрэвы 104
Хварэю на сэрца 105

АБ ВЕЧНАСЬЦІ І ЧАСЕ

Паперы . . . 108
Некалі даўно . . . 108
Круг . . . 109
На золку не сплю . . . 110
Вочы . . . 110
Цягнік . . . 110
Адна трыццатая секунды . . . 111
Камета Гальлея . . . 112
Два крыжы . . . 113
Дрэвы Вечнасьці і перамен . . . 114
Іду на спатканьне . . . 114
Бярозы на ветры . . . 115
Валун . . . 116
Чакаю бацьку з вайны . . . 117

РАДЫЯЦЫЯ

Труна . . . 120
Радыяцыя-7 . . . 121
Яблыня . . . 121
Паўдзённы вецер . . . 123
Дождж . . . 124
Субота . . . 124
Іду праз вёску . . . 124
Пыл . . . 125
«На ўсіхных тварах...» . . . 125
Мёд . . . 125
Смог . . . 125
Радыяцыя-9 . . . 126
Музыка воблакаў, лісьцяў і траў . . . 127
Радыяцыя-11 . . . 129

ВІЛЬНЯ

Лес за сіняй смугой . . . 132
Віленшчына . . . 133
Там, далёка . . . 134
У Вільні . . . 134
Цьвітуць яблыні . . . 134
Раніцой ля катэдры . . . 134
Віленка . . . 135
Ранак на Антокалі . . . 135
Каўкі . . . 136
Тамлюся душою . . . 136
Віленскі брук . . . 136
Глёрыя Патрыя . . . 137
Фатаграфуе Ян Булгак . . . 138
Факсрот . . . 139
Яблыні . . . 140
Узіраюся ўдалячынь . . . 140
Над палямі . . . 140
«Імкнуся ў край бацькоўскі...» . . . 141
Запаветнае . . . 141

МЕНСК
Няміга . . . 144
Над Сьвіслаччу зімой . . . 147
Песьні . . . 147
Кельля у доме Бернардынцаў . . . 148
Непагадзь па вясьне . . . 149
Старажоўка . . . 150

ЗОРКА МАКСІМА
Упершыню ўбачыў . . . 154
«Даўно ўжо сэрцам я хварэю» . . . 154
Максім . . . 155
Зімой у марозную ноч гляджу на зорнае неба . . . 155
Успамін пра Багдановіча . . . 156
Праз 25 гадоў успамінаю вобраз вячэрняй пары . . . 157
«Я не самотны...» . . . 157

ХВАРОБА
Месяц . . . 160
Хвароба . . . 160
Нямы дом . . . 161
Імгненьне . . . 161
Восеньскай ноччу . . . 162
Ізноў хварэю . . . 162
Келіх . . . 164
У Вялейцы . . . 164
Ізноў вярнулася журботная пара . . . 165
Ляжу ў шпіталі . . . 165
Шуміць вецер . . . 166
Думаю пра Еву . . . 167
«Горача кружыцца галава...» . . . 167
«На сёмы дзень хваробы, вясной...» . . . 167

ПАГАНСКІ ДУХ
Жаўна . . . 170
Заціменьне месяца . . . 170
Закляцьце . . . 172
Гарадзішча . . . 172
Запусьценьне . . . 173
Русалка . . . 174

СЬВЯТЛО ХРЫСЬЦІЯНСТВА
Звон . . . 177
Гучаньне анёльскага голасу . . . 178
Куранец . . . 179
Касьцяневічы . . . 179
Холад . . . 180
Полацак . . . 180
Цярпеньне . . . 180
У старой царкве . . . 181
Homo pulcher . . . 182
Сьветлы касьцёл . . . 184
Грамніца . . . 185

ФАТАГРАФІІ

Сасна 187
Ружа 188
На беразе Гаўі 189
Цёплае лета 189
Летам 189
Маёвай парой 190
Цьвіце гарох 190
Родны від 190
Неўласьцівасьць 190
Месячнай ноччу 190
Чэрвень 191
Пялёсткі півоні 191
«Паветку адчыніў...» 191
Сажалка 191
Некалі на Браслаўшчыне 192
Канчаецца лета 193
Гудок 193
Еду аўтобусам 193
Мінае лета 193
Асеньні матыў 193
Асеньні шлях 194
«Прасьветленая маркота...» 194
Орша 195
Ула 195
Раніца 195
Люблю, калі ўсё цьвіце 195
Гаўя 195
«О, мой краю...» 195
Лубін 196
Кавярня 196
Бачу, як дзеці гуляюць з сабакам 197
Праз 15 гадоў пасьля сьмерці Лявона Баразны 197
Памёр чалавек 197
«Дарога кветак» 198
Серабрыстая ноч 198
Мінуў дзень нараджэньня 198
Бяссоньніца ў вясновую ноч 199
Травень 199
Абсяг 199
Поўдзень 199
На будоўлі 200
Вясковец 200
Летняя ноч 200
Цёплы ліпень 200
На беразе мора 201
Гукі дажджу 201
Сьвяты дзень 202
Сустрэча 202
У Івянцы 202
Успамінаю пра Нёман 203
На маладзіку 203
Белыя лебедзі 203

Мілавіца 203
Лілея 203
Зьбіраю кветкі 204
Разьвітаўся з каханай 204
Аднатыпнасьць 204
Вечарэе 204
Выган 205
Люцінка 205
Цямнее 206
Удалечыні 206
Родныя сьцены 206
Трывога 207
Даганяю страчанае 207
Ідуць дні 207
Ападаюць лісты 207
Рэчка 208
Слухаю дрэвы 208
Добра пісаць 208
«Сябры — у маладосьці...» 209
Вішні 209
У красавіку 209
Ад'язджаю цягніком 210
Першы сьнег 211
Танга над Гаўёй 214
Перамена 215
Ліставей над Гаўёй 215
Стары млын 215
Крумкач 217
«Вось лес — народа лёс» 217
Змрок у падсечаным лесе 217
«Ідучы пехатой па старым гасьцінцы...» 217
Раніцой іду праз луг 217
На пероне 218
Нядзельны ранак 218
Іду праз могілкі 219
Дома перад навальніцай 219
На сьвітаньні 219
Іду па Вялейцы 222
Зімой 222
Сон пад ветрам 222
Далёкі вобраз 223
Прачынаюся 224
Прысады 224
Крым 224
Гурзуф 224
Чытаю паэзію новых формаў 225
Напамінаньне 225
Прамінаньне 225
Сьцежка 226
Старая печ 226
Галубы 226
Стары Івянец 227
Год за годам 227

Адзінота ў верасьні 227
Жнівеньскі дзень 228
Капуста 230
Певень 230
Пасяліўся ў гасьцініцы 231
На рынку 231
Флёксы 231
Ноч на дваіх 232
«Калі я прыехаў сюды зноў...» 233
Народнае сьвята 234
Кастрычнік 234
Брудная вайна 235
Вайна 235
Сакавік 236
Вішні-I 236
Сьветлы травень 236
«Песьня мая...» 237
«Я даўно зразумеў...» 237

ПРЫПАВЕСЬЦІ

Брама 240
Заслона 242
Скрыжаваньне 243
Нехта сьветлы 244
Воз 245
Шукальнікі 248
Ноша 250

СУМНЫЯ ВЕРШЫ

Асеньні бульвар 253
Восень у Вязынцы 254
Жнівеньскі месяц 255
Угодкі 256
Жоўтыя воблакі 256
«Я шукаў цябе, мілая...» 256
Яблынёвы сад 260
Лошыца-78 260
Паляваньне 261
Шкадаваньне асеньняга дня 262

АПСНЫ

Зыбкая цеплыня 263
У гарах 264
Верабейка 264
Анакапія 264
Над морам 264
Храм на гары Апсара 265

ПРОПАВЕДЗІ

Ісьціна 268
Злачынства 268
Пустата 268
Размова з маленькім чалавекам 270
Хлюсты 271
Прамоўцы 272

Развагі для сябе 272
Кола часу 278
«Журбой асьвятляецца дух» 282
Тыя 282
Кроў чалавецтва 282

АДЛЮСТРАВАНЬНЕ

Зімовы дзень 285
Квітнеючы сад у вясновую ноч 286
Сьвітаньне 286
Цяпло 286
Мэлёдыя 287
Старое мястэчка 287
Ледавік 288
Раніца ў кастрычніку 290
Пішу ў красавіку, калі зышоў сьнег 290
Рэзкі вецер у жніўні 291
Татарскі магільнік 294
Дрывяты 294
Лодка 296
Мікасецк 297
Жнівень у Мікасецку 297
Пад елкамі хаваюся ад дажджу 297
Час асіны 298
Разьліў 299
Ружовы сон 300
Пасьля навальніцы іду паміж дрэў 300
Раніца на Пцічы 300
Стаў 301
Ціхі вечар у сьнежні 301
Сакавік 301
Позьні жнівень 302
Зіма 303
На Іслачы думаю пра інсургентаў 303
Бабіна лета 304
Позірк зь Вялейкі 304
Вязынка 304
«Бабіна лета сьцелецца мройна...» 305
На сярэдзіне Пцічы 305
Букет 305
У гасьцях у Ларысы Геніюш. 1978 год 306
Перад сьвітаньнем 307
Балота 307
Лясьнік 308
Цьвіценьне 309
Першы снегапад 309
Альшаны 309
Цёплы дождж у ліпені 309
На Грунвальд! 310
Багаславеньне рыцару 312
1989 год 313
Дзяды 314
Дзень нараджэньня 315
Настальгія 316

Лаза . . . 317
У дзяцінстве трапляю ў вір . . . 317
У гасьцініцы . . . 317
Вясной у далёкіх мясьцінах . . . 318
Рэха . . . 318
Яблык . . . 319
Ля-мажор . . . 319
Сінія астры . . . 319
Аднойчы вясной . . . 320
Шкадую аб вясьне . . . 320
Хмара . . . 320
Хлопчык уначы . . . 321
Ліст белай паперы . . . 321
Пішу як бывае . . . 322
Пішу з памяці . . . 322
Гучаньне анёльскага голасу (песьнявы варыянт) . . . 323
Мсьціслаў . . . 324
Лебедзева . . . 324
Павевы . . . 324
Шэрая восень . . . 325
Старая паштоўка . . . 326
Раскладаю цяпельца . . . 327
Візіт генерала . . . 327
Мроя над клёнавым лісьцем . . . 328
Расстаньне з каханай . . . 328
Адзінокі прахожы . . . 328
Гляджу на дрэва . . . 329
Асеньняе неба . . . 329
Вячэрні цягнік . . . 329
Фатаграфія ў стылі мадэрн . . . 330
Чытаю Басё . . . 330
Страла . . . 330

ЗАЦЕМКІ

Харство Боскае і краса дэманічная . . . 333
Знакі . . . 334
Перараджэньне . . . 334
Харство і боль . . . 334
Эстэтыка дабра і зла . . . 335
«Раней зьдзіўляўся» . . . 336
«Як думаем — так і жывём...» . . . 336
«Стралою думка мільганула...» . . . 336
«Закон жыцьця, дадзены Богам дрэву...» . . . 336
Паганцы . . . 337
«Чалавека вылучае ў прыродзе тое...» . . . 337
«У чым сіла старажытнага Кітая...» . . . 337
«Рухнула імперыя...» . . . 338
«Накірунак хрысьціянскага мастацтва...» . . . 338
«Харство...» . . . 339
«Хваля...» . . . 340
Крэда . . . 340
«Найвышэйшая мера паэзіі...» . . . 340
«Вершы самі па сабе...» . . . 340
Карціна сьвету . . . 340

Літаратурна-мастацкае выданьне

Зянон
ГЛЁРЫЯ ПАТРЫЯ
(вершы і фатаграфіі 80-х гадоў)

Р э д а к т а р
Уладзімір Арлоў

М а с т а к
Пётра Драчоў

К а р э к т а р
Яніна Татарыцкая

Н а б о р
Алена Краснеўская

М а к е т а в а н н е
Андрэй Трусевіч, Наталя Дайнека

Падпісана ў друк 25.03.96. Фармат 70x108 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Лазурскага.
Афсетны друк. Ум. друк. арк. 28,6. Наклад 1000 асобнікаў. Замова № 181.
Таварыства беларускай культуры ў Літве. Вільня, 2004, вул. Жігімонта, 12-3.
Друкарня "Ортдрук". PL 15-399, Беласток, вул. Складовая, 9.

Подпісы да фатаграфіяў

Стар. 5 -- Дарога ў Суботнікі з боку Юрацішак.
Стар. 18 -- Дзед Ваявода, 97 гадоў. Браслаў.
Стар. 24 -- Касцёл у Івянцы (пабудаваны ў 1908 г.)
Стар. 30-31 -- Від на Слабодку з касцёлам. (Браслаўшчына)
Стар. 34 -- Родны дом. (Суботнікі)
Стар. 42 -- Менск. Вуліца Інтэрнацыянальная (былая Валоцкая) 1978 г.
Стар. 43 -- Менск. Траецкае прадмесьце, уезд у двор. 1978 г.
Стар. 44-45 -- Менск, Кальварыя. 1978 г.
Стар. 48 -- Полацкі Сафійскі сабор, 1980-я гг. (пасьля рэстаўрацыі і прыстасаваньня).
Стар. 70 -- Касцёл у Відзах.
Стар. 71 -- Дарога на Браслаўскае замчышча.
Стар. 74-75 -- Рыга.
Стар. 80 -- Па дарозе на Люцінку, 1978 г.
Стар. 82 -- Вечар над Суботнікамі, 1982 г.
Стар. 126 -- Вульлі. Вёска Запярыньне, Пухавіцкі раён.
Стар. 130 -- Вільня. Вострая Брама.
Стар. 131 -- Вільня. Касцёлы Ганны і Бернардынцаў.
Стар. 144 -- Менск. Палац прафсаюзаў.
Стар. 145 -- Менск. Цэнтральная плошча. 1966 г.
Стар. 149 -- Менск. Траецкае прадмесьце да рэстаўрацыі (1976 г.)
Стар. 162 -- Менск. Балькон на доме XIX ст. па вуліцы Гандлёвай. (Чыгуннае ліцьцё. Зьнішчаны ў 90-х гг.)
Стар. 163 -- Слонім. Франтон касцёлу сьв. Андрэя (фота 1964 г.)
Стар. 176 -- Друя. Касцёл Базылянаў (XVII ст.) Фота 1968 г.
Стар. 178 -- Браслаў. Від з Замкавай гары на возера Навята.
Стар. 179 -- Драўляны касцёл у Дрысьвятах (XVII-XIX ст.) Фота 1968 г.
Стар. 181 -- Менск. Сабор Сьвятога Духа (былы касцёл Бэрнардынак, 1642 г.)
Стар. 184 -- Пінск. Касцёл Францысканцаў.
Стар. 192 -- Вёска Зарачча (Браслаўшчына). Мураваны млын. (Зьнішчаны ўладамі ў 1980-х гг.) Фота 1968 г.
Стар. 238 -- Івянец. Могілкі.
Стар. 239 -- Нясьвіж. Плястыка ў Фарным касцёле.
Стар. 241 -- Менск. Кальварыйская брама. Фота 1978 г.
Стар. 269 -- Слабодка. Уваход у касцёл. Фота 1968 г.
Стар. 339 -- Нясьвіж. Роспіс у Фарным касцёле.

Гэтую кнігу фота-вершаў яшчэ ў 1995 годзе ўгаварыў мяне зрабіць пісьменьнік Уладзімер Арлоў. Ён жа парупіўся выбраць тэксты з стосу колішняй маёй пісаніны. Я сабраў сякія-такія фатаграфіі, што неяк у мяне ацалелі (бо друкаваць спэцыяльна з нэгатываўня меў ні часу ні магчымасьцяў), і тады мой даўні сябар мастак Пётра Драчоў скампанаваў кнігу. Дзесьці ў красавіку-траўні 1996 году яна павінна была ўбачыць сьвет. Але ў канцы сакавіка я апынуўся на чужыне, і ўсё спынілася. Міналі дні і месяцы, гады змаганьня і цярпеньня. І тут я адчуў, якая дарагая мне гэтая страчаная кніжка: і тыя словы, што пісаў для сябе проста так, і старыя фатаграфіі, дзе белыя вішні, дарогі ды шэры пыл...

Бог даў мне шанец выдрукаваць яе цяпер бяз зьменаў як успамін аб даўняй мінулай пары, аб шчымлівых днях, каб заспакоіць душу.

25 ліпеня 2000 году Аўтар

Варшава.

ISBN 9986-9228-7-9

Мёртвый Данилов клад

ЮНЫЙ ЗНАТОК